

БАЙЦЫ НЯБАЧНАГА ФРОНТУ 3



АДЧУЙЦЕ СЯБЕ РАБІНЗОНАМ 4


18 ЖНІЎНЯ 2022 г.
ЧАЦВЕР
№ 161 (29783)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА


## НОВЫЯ ЛЮДЗІ НА АДКАЗНЫХ ПАСАДАХ

**Шэраг важных кадравых рашэнняў прыняты Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка беларускай дзяржавы.**

Валерый Іваноў, які больш за год узначальваў Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта, звярнуўся да кіраўніка дзяржавы з просьбай разгледзець яго хадайніцтва аб пераходзе на іншую работу. Аляксандр Лукашэнка гэту просьбу падтрымаў.

Трэба адзначыць, што за непрацяглы час работы Валерый Іваноў змог арганізаваць калектыў на выкананне пастаўленых кіраўніком дзяржавы задач і дабіцца сур'ёзных вынікаў у развіцці арганізацый, падпарадкаваных Кіраўніцтву справамі. Варыянты прымянення яго вопыту і ведаў на іншым важным напрамку будуць разгледжаны ў самым хуткім часе, пасля паляпшэння стану здароўя.

Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь узначаліў Юрый Назараў, які дагэтуль на пасадзе намесніка прэм'ер-міністра курыраваў пытанні развіцця машынабудавання, нафтахіміі, дрэваапрацоўкі і навукі. Юрый Назараў мае значны вопыт кіруючай работы на самым высокім дзяржаўным узроўні. Працаваў у сістэме Кіраўніцтва справамі, займаў пасаду намесніка кіраўніка ў 2010—2013 гадах. Глыбока валодае спецыфікай вытворчых і эканамічных працэсаў гэтай шматпрофільнай структуры.

У сваю чаргу, пасаду віцэ-прэм'ера зойме Пётр Пархомчык, які да гэтага часу працаваў на пасадзе міністра прамысловасці. Ён з'яўляецца высакакласным арганізатарам вытворчасці, больш за 13 гадоў узначальваў флагман прамысловага комплексу Беларусі — БелАЗ. Ён у курсе ўсіх даручэнняў і патрабаванняў кіраўніка дзяржавы, выкананне якіх будзе курыраваць на новай пасадзе.

# ВЫТОКІ, ШТО НАС ЯДНАЮЦЬ



*Архівіст Алена ВАРАНКОВА жыве ў далёкім Чалябінску. Шмат гадоў яна марыла трапіць у Пустынскі манастыр, што знаходзіцца ў ваколіцах нашага Мсціслава, на беларуска-расійскім памежжы. Зацікаўленасць гэта абгрунтавана: Алена, кандыдат філалагічных навук, вывучае гісторыю старажытных мсціслаўскіх земляў, якія цяпер знаходзяцца па розныя бакі мяжы, а пустынская абіцель заўсёды была духоўным цэнтрам, і для навуковай працы гэтае падарожжа было важнай справай. Сёлета Алена Мікалаеўна сваю мару спраўдзіла — наведала старажытны Мсціслаў і, вядома ж, Успенскі манастыр. Дакранулася да падмуркаў святыні, набрала гаючай вады — прычынілася да вытокаў.*

**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

### ЛІЧБА ДНЯ

**12,2 млрд рублёў**

*склала вытворчасць прадукцыі сельскай гаспадаркі ў студзені—ліпені 2022 года ў гаспадарках усіх катэгорый (сельскагаспадарчых арганізацыях, сялянскіх (фермерскіх) гаспадарках, гаспадарках насельніцтва), паведаміў Нацыянальны статыстычны камітэт.*
*У сельскагаспадарчых арганізацыях выраблена прадукцыі на Br11,7 млрд.*
*У гаспадарках усіх катэгорый атрымана 1,008 млн тон жывёлы і птушкі ў жывой вазе, 4605,6 тыс. тон малака, 2017,4 млн яек.*
*На долю сельскагаспадарчых арганізацый прыпадае 97,1 працэнта аб'ёму вытворчасці жывёлы і птушкі ў жывой вазе, 97,5 працэнта малака і 83,8 працэнта яек.*
*На 1 жніўня 2022 года ў сельскагаспадарчых арганізацыях налічвалася 4,1 млн галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку кароў 1,4 млн. Колькасць свіней склала 2,3 млн.*

Ураджай-2022

## БЛІЗКА ДА ШАСЦІ МІЛЬЁНАЎ




Дабрыня

## «Я Ў МАМЫ СОНЕЙКА»



**— Кветачка, матылёк, сонейка. Яно заўсёды павінна свяціць, згодная?**
**— А мама кажа, што сонейка — гэта я!**
**Сведкам таго непасрэднага і вясёлага дыялогу-гульні ў казачны свет праз папяровую аплікацыю станаўлюся ў незвычайным дзіцячым пакоі. Яркае, спецыяльна абсталяванае памяшканне са мноствам інтэрактыўных «карыснасцяў» — адно з чатырох адкрытых на тэрыторыі Гомельшчыны абласной арганізацый Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа. Тут дзіцячы пакой — гэта форма падтрымкі дзяцей з сем'яў вымушаных бежанцаў з Украіны. Якраз ёсць магчымасць паглядзець, як тут арганізоўваюць заняткі. Назіраю за стасункамі Дарыны і педагога па адукацыі, старшыні Гомельскай раённай арганізацыі Беларускага Чырвонага Крыжа Кацярыны ТРЭГУБАВАЙ.**

СТАР. 7

Дарогі

## Каляровая разметка і новыя знакі

### Транспартнікі Беларусі расказалі, як рыхтуюцца да зімы



Фота Ірыны СІДАРОК.

**Дзеля бяспечнага пачатку школьнага сезона на сталічных вуліцах, якія прымыкаюць да ўстаноў адукацыі, дарожнікі стварылі 380 надпісаў «ШКОЛА» і абазначылі 950 пешаходных пераходаў непадалёк ад навучальных устаноў. А для дадатковай увагі кіроўцаў над праезнай часткай паблізу ад пешаходных пераходаў размясцілі дадатковыя дарожныя знакі «пешаходны пераход», якія маюць жоўты беражок з выкарыстаннем плёнкі на алмазнай аснове.**

СТАР. 3

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### «Газпрам» дапусціў, што ўзімку цэны на газ у Еўропе перавысяць $4000 за тысячу кубаметраў



У паведамленні расійскага холдынга адзначаецца, што кошт блакітнага паліва на спотавых біржах у Еўропе ўжо цяпер перавышае 2,5 тысячы долараў за тысячу кубаметраў. «Па кансерватыўных ацэнках, калі тэндэнцыя захаваецца, узімку цэны перавысяць узровень $4 тыс. за 1 тыс. куб. м», — адзначылі ў « Газпраме». Днямі кошт за тысячу кубаметраў газу на лонданскай біржы ICE упершыню з сакавіка перавысіў $2630. Рост цэн адбываецца ў сувязі з павышэннем цэн на блакітнае паліва ў Азіяцкім рэгіёне, зніжэннем ветрагенерацыі ў еўрапейскіх краінах, а таксама з-за рамонтных работ на аб'ектах, звязаных са здабычай і транспарціроўкай газу ў Нарвегіі.

### Мільёны брытанцаў вымушаныя эканоміць на прадуктах харчавання

Жыхары Вялікабрытаніі адмаўляюцца ад куплі тых ці іншых прадуктаў харчавання, каб сэканоміць. Такія даныя прыводзяцца ў выніках апытання, апублікаванага газетай Times, паведаміла РІА «Навіны». Апытанне праводзіла даследчая кампанія YouGov у пачатку жніўня. У ім узялі ўдзел 1717 паўналетніх жыхароў Злучанага Каралеўства. Згодна з вынікамі апытання, за апошнія паўгода кожны шосты жыхар краіны рэгулярна адмаўляўся ад сняданку, абеду ці вячэры з мэтай эканоміі грошай. Таксама палова брытанцаў пачала значна радзей наведваць кавярні і рэстараны.



### У Нідэрландах падчас пратэстаў фермераў паліцыя затрымала больш за 100 чалавек

Паліцэйскія правялі затрыманні падчас пратэстаў, якія прайшлі ў краіне ў апошнія тыдні, паведаміла ТАСС. Па звестках сілавікоў, пратэстоўцаў у асноўным затрымлівалі за блакаванне дарог і падпалы. Акрамя таго, некалькім людзям было прад'яўлена абвінавачанне ў замаху на забойства. Адзначаецца, што большасць затрыманых — маладыя людзі ва ўзросце да 30 гадоў. Паліцэйскія таксама выпісалі сотні штрафаў за наўмыснае зніжэнне хуткасці пры перамяшчэнні на аўтамабілях па дарогах. Як вядома, фермеры пратэстуюць у Нідэрландах не першы месяц. Яны патрабуюць ад улад краіны адмовіцца ад прынятага рашэння па скарачэнні выкідаў азоту. Дадзеная мера накіравана на ахову навакольнага асяроддзя, аднак у той жа час яна прывядзе да банкруцтва фермерскіх гаспадарак. Адзначаецца, што акцыі пратэсту мелі эфект. Так, буйныя палітычныя партыі Нідэрландаў ужо паставілі пад пытанне дзеянні ўрада.



ISSN 1990 - 763X

### КОРАТКА

• Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Дзмітрыя Мезенцава з днём нараджэння.

• **Дапамога сем'ям на падрыхтоўку дзяцей да навучальнага года аказана на Br21,5 мільёнаў. Аднаразовая матэрыяльная дапамога даецца незалежна ад даходу сям'і. Яе памер складае Br98,55 (30 працэнтаў БПМ) на кожнага школьніка ў сям'і.**



• ДАІ настойліва рэкамендуе кіроўцам кантраляваць самаадчуванне падчас спякоты.

• **Жывапіс і графіку Леаніда Шчамялёва прадставяць на выставе да 955-годдзя Мінска.**

Жыллё мае

## «ЭЛЕКТРЫЧНЫЯ», АРЭНДНЫЯ, УЛАСНЫЯ...

### Мільёны квадратных метраў будуюцца для беларусаў

**Сёлета ў краіне плануюць пабудаваць 4,2 млн м² жылля. Гэта арэнднае, «электрыфікаванае», ствараемае з дзяржпадтрымкай і іншыя віды жылля. Як беларусаў забяспечваюць годнымі ўмовамі пражывання і як будаўнікі спраўляюцца з арганізацыяй сацыяльнай інфраструктуры, расказалі эксперты галіны.**

СТАР. 2



# «ЭЛЕКТРЫЧНЫЯ», АРЭНДНЫЯ, УЛАСНЫЯ...

## ЭФЕКТЫЎНА, ХУТКА, ЗРАЗУМЕЛА

Такія задачы ставіць перад сабой айчыннае будаўніцтва. Гэтая галіна ў краіне эфектыўна працуе. Айчынныя будаўнікі актыўна выходзяць на знешнія рынкі і ўзводзяць будынкі ў Беларусі. Вялікія змяненні звязаныя з нарматыўна-прававой базай, падкрэсліў **Аляксей АНАНІЧ, намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва:**

— У маі ў першым чытанні быў прыняты Кодэкс аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці, згодна з якім па-новаму будуць рэгулявацца пытанні, звязаныя з нармаваннем у будаўніцтве. Вядзецца работа і па абыходжанні з адходамі ў будаўніцтве.

Лідары па будаўніцтве жылля, дзе выкананне плана перавышае 50 %, — Брэсцкая, Гомельская і Гродзенская вобласці. За першае паўгоддзе ў тым ліку створана 883,7 тысячы $м^2$ індывідуальнай забудовы, а гэта 46 % пры ўстаноўленым паказчыку не менш за 40 %, агучыла лічбы **Таццяна ВАСІЛЮЧАК, начальнік упраўлення будаўніцтва і жыллёвай палітыкі Мінбудархітэктуры:**

— Збудавана таксама 5204 кватэры агульнай плошчай 403 тысячы $м^2$, 4941 шматдзетная сям'я сёлета ўжо атрымала жыллё.

## А ШТО З ІНФРАСТРУКТУРАЙ?

Асноўная мэта праграм па будаўніцтве жылля — дасягнуць узроўню забяспечанасці насельніцтва жылплошчай у Беларусі ў памеры 28,5 $м^2$ на чалавека.

— За 2016—2020 гг. у Віцебскай вобласці збудавана 1,5 млн $м^2$ жылля, мэта перавыканана — на жыхара Віцебшчыны прыходзіцца па 29,5 $м^2$. Пры гэтым у раёнах і сельскай мясцовасці дадзены паказчык — каля 40 $м^2$, а ў буйных гарадах — 27 $м^2$, — расказаў **Андрэй ПШОНКА, начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі і інвестыцый камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Віцебскага аблвыканкама.**

Летась у вобласці збудавалі 331,7 тысячы $м^2$ замест запланаваных 330 тысяч $м^2$. Жыллё атрымала больш за 1200 шматдзетных сем'яў, збудавалі жыллё для больш за 2,5 тысячы асоб, якія мелі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

— Сёлета заданне па вобласці павялічана да 355 тысяч. За паўгоддзе будаўнікі ўвялі 119,2 тысячы $м^2$ жылля і забяспечылі ім 333 шматдзетныя сям'і. Збудавана таксама 5,5 тысячы $м^2$ арэнднага жылля і каля 16 тысяч $м^2$ — у будынках, дзе для ацяплення і гатавання ежы выкарыстоўваецца электрычнасць, — падзяліўся лічбамі спецыяліст.

Праз вялікую колькасць будуемага жылля ў краіне паўстае іншая праблема — недахоп аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры: дзіцячых садкоў, школ, паліклінік, падкрэслілі спецыялісты.

— У мікраараёне Білева ў Віцебску, напрыклад, пражывае каля 40 тысяч грамадзян, з якіх звыш 12,6 тысячы — непаўналетнія. А 3,5 тысячы пры гэтым — дзеці дашкольнага ўзросту. І толькі тры навучальныя ўстановы. Так што патрэба ў забеспячэнні месцамі ў пяць разоў перавышае тыя, што існуюць, — заўважыў Андрэй Пшонка.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



## НЕЗАПАТРАБАВАНЫЯ КВАТЭРЫ

Хоць у Беларусі чарга асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, не знікае, у краіне ёсць нерухомасць, набыць якую людзі не могуць нават з дзяржпадтрымкай. Попыт на жыллё ў Віцебскай вобласці апошнім часам, напрыклад, істотна знізіўся. За першае паўгоддзе сёлета з 11 тысяч сем'яў, якія стаяць на чарзе асоб, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, пагаджаюцца на будаўніцтва нямногія, абазначыў праблему Андрэй Пшонка:

— Больш за 700 тысяч кватэр у дамах, якія будуюцца, не маюць ахвотных на набыццё, так што сродкаў дзяржаўнай падтрымкі дастаткова. Летась і сёлета тыя, хто меў права на паляпшэнне жыллёвых умоў, гэта зрабілі.

Існуе праблема пустых кватэр і на Магілёўшчыне. Нават тыя, хто мае права на будаўніцтва жылля са сродкамі сацпадтрымкі, не заўжды могуць сабе тое дазволіць, таму ў рэгіёне ідзе пераарыентацыя на будаўніцтва арэнднага жылля.

— У шэрагу рэгіёнаў сапраўды ёсць незапатрабаваныя пустыя квадраты, бо гранічны нарматыў дзяржпадтрымкі не дае магчымасць пакрыць кошт квадратнага метра, і людзям патрэбнае дакрэдытаванне. Аднак высокія стаўкі (напрыклад, 17,5 % у Беларусбанку) не дазваляюць многім беларусам, якія будуюцца з дзяржпадтрымкай, даплаціць гэтую розніцу за жыллё, — растлумачыла праблему пустых кватэр у новабудоўлях Таццяна Васілючак.

## БОЛЬШ АРЭНДНАГА

У Магілёўскай вобласці сёлета павінны збудаваць 330 тысяч $м^2$ жылля: каля 70 шматкватэрных дамоў і 130 тысяч — індывідуальных. Пакуль узведзена 11 шматкватэрных і 70 тысяч індывідуальных, расказаў **Аляксандр МАРФОНАЎ, начальнік аддзела жыллёвай палітыкі камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Магілёўскага аблвыканкама:**

— Нягледзячы на не надта высокія тэмпы будаўніцтва, вобласць можа пахваліцца наяўнасцю двух заводаў буйнапанэльнага домабудаўніцтва, якія мадэрнізаваны і выйшлі на добрыя тэмпы загрузкі. Прадпрыемствы будуюць фактычна ўсё жыллё на Магілёўшчыне, за выключэннем вёскі, дзе працуюць перасовачныя механізаваныя калоны, якія выкарыстоўваюць дробна-штучныя матэрыялы. Дык вось, з 11 дамоў сем «шматкватэрнікаў» былі збудаваны заводамі.

Акрамя таго, за паўгоддзе палепшылі ўмовы пражывання больш як 300 шматдзетных сем'яў Магілёўшчыны, а да канца года ўласнае жыллё атрымае тысяча такіх сем'яў. У вобласці пераходзяць на больш актыўнае будаўніцтва арэнднага жылля. 39 такіх кватэр сёлета ўжо ўзвялі, яшчэ 300 збудуюць да канца года.

**«Праз вялікую колькасць будуемага жылля ў краіне паўстае іншая праблема — недахоп аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры: дзіцячых садкоў, школ, паліклінік, падкрэслілі спецыялісты».**

## «ПАНЭЛЬКА» ЗАМЕСТ УЛАСНАГА ДОМА

Нягледзячы на тое што Гродзеншчына — найменшы рэгіён па колькасці насельніцтва, яна займае адну з перадавых пазіцый па жыллёвым будаўніцтве. Тут найвышэйшая забяспечанасць жыллём па краіне — 32 $м^2$ на чалавека, заўважыў **Юрый ХАЛІМОНЕНКА, першы намеснік старшыні камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Гродзенскага аблвыканкама.**

— Сёлета мы па ўласнай ініцыятыве ўзялі дадатковыя аб'ёмы (на 25 тысяч больш, чым запланавана дзяржпраграмай) па будаўніцтве жылля і мусім узвесці да канца года 475 тысяч «квадратаў».

Сёлета ў рэгіёне крыху знізіліся аб'ёмы будаўніцтва індывідуальнага жылля, бо людзі пераарыентавалі свае жаданні на нерухомасць у шматкватэрных дамах — на куплю жылля ў новых дамах на камерцыйнай аснове.

Спецыялісты на ўзроўні райцэнтраў правялі апытанне беларусаў, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў: ці не хочуць яны будаваць індывідуальнае жыллё замест нерухомасці ў шматкватэрным будынку? У адказ

**«Гранічны нарматыў дзяржпадтрымкі не дае магчымасць пакрыць кошт квадратнага метра, і людзям патрэбнае дакрэдытаванне».**

пачулі, што, па-першае, сродкаў на гэта спатрэбіцца значна больш, а па-другое, дзеці не хочуць жыць разам з бацькамі.

— Тым не менш, сектар індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва развіваецца. З'яўляюцца новыя мікраараёны, ствараецца інфраструктура. Актыўна гэта адбываецца, дарэчы, у Гродне і Лідзе.

Актыўна будуюць у рэгіёне і дамы з выкарыстаннем электраэнергіі — узвялі ўжо 14 тысяч $м^2$ (амаль палову ад запланаванага). Людзі ахвотна ідуць у такія дамы і ў цэлым задаволеныя і ўмовамі пражывання, і наступнымі плацяжамі, заўважыў спецыяліст. У Слоніме, напрыклад, сёлета пачынаюць ужо трэці «электрычны» дом на 170 кватэр, а ў абласным цэнтры ў мікраараёне Грандзічы мяркуюць стварыць 40 тысяч $м^2$ электрыфікаванага жылля.

Павялічваецца ў вобласці і колькасць будуемых арэндных метраў, за якімі, на думку спецыялістаў, будучыня, бо чалавек павінен атрымліваць жыллё там, дзе ён працуе. Пакуль гэта робіцца за кошт бюджэту, але з часам мяркуюць прыцягнуць сродкі на такое будаўніцтва і ад прадпрыемстваў, якія могуць такім чынам заахвоціць спецыялістаў на работу ў сябе.

## КАМЕРЦЫЙНЫЯ І ДЗЯРЖАЎНЫЯ

Акрамя дзяржаўных гульцоў, на будаўнічым рынку прысутнічаюць і прыватныя кампаніі. Аднак камерцыйным арганізацыям, перш чым пачынаць будаўніцтва, трэба набыць зямлю з аукцыёну. А за апошнія гады ў Беларусі ўжо збудавана столькі, што засталося мала свабодных пляцовак, таму ўся зямля раздаецца дзяржаўным заказчыкам. Тым не менш, яны таксама могуць узводзіць камерцыйнае жыллё.

— У Магілёўскай вобласці два буйныя заводы будуюць як для грамадзян, якія маюць патрэбу ў жыллі, так і камерцыйнае жыллё, карыстаючыся сваімі прэферэнцыямі па атрыманні зямельных участкаў без аўкцыёнаў, — заўважыў Аляксандр Марфонаў. — Гэта жыллё павышанай камфортнасці ў добрых месцах, і цана там вышэйшая, чым у дамах для тых, хто мае патрэбу.

У Віцебскай вобласці працуюць два прыватныя забудоўшчыкі: арганізацыя «Жылбуд», якія працуюць непасрэдна з упраўленнямі капітальнага будаўніцтва (дзяржаўнымі), і арганізацыя «Будгандальсэрвіс», якая цяпер дамы не будуе, падзяліўся Андрэй Пшонка:

— З прыватнымі заказчыкамі цяжка працаваць, бо ў іх ёсць аб'екты са звышнарматыўнымі тэрмінамі будаўніцтва. Ёсць у іх грошы — яны будуюць, няма — не.

90 % жылля на Гродзеншчыне стварае домабудаўнічы камбінат «Гроднажылбуд», які будуе ў тым ліку і камерцыйнае жыллё. Аднак ёсць і прыватныя забудоўшчыкі, дадаў Юрый Халімоненка:

— Яны займаюцца комплекснай забудовай мікраараёнаў індывідуальнага жылля, то-бок узводзяць цэлыя комплексы блокавых жылых дамоў. У райцэнтрах мясцовыя ці прыватныя арганізацыі, калі попыт на камерцыйнае жыллё ёсць, узводзяць шматкватэрнае жыллё, аднак тое адбываецца раз на два-тры гады.

**Ірына СІДАРОК.**

Па сутнасці



# МОМАНТ ІСЦІНЫ

**Тыя, хто ўважліва слухаў выкладчыкаў журфака БДУ, добра памятаюць залатое правіла класічнай журналістыкі. Першы сказ робіць усю атмасферу артыкула. А вось і прыклад. Пасля страшэннага землятрусу ў Сан-Францыска спрытны газетны калумніст напісаў коратка, затое змястоўна: «Сан-Францыска больш не існуе».**

Прабачце, я таго калегу паўтару: беларускай апазіцыі больш не існуе. Сама сябе дыскрэдытавала. Ніхто не будзе падтрымліваць тых, хто наўмысна альбо па крывізне розуму і душы намагаецца знішчыць народ і дзяржаўнасць. Нават тыя, хто апекаваў і кіраваў, не будуць так шчодра інвеставаць у палітычных лузераў. Час і падзеі ва Украіне расставілі ўсё на свае месцы. Тым больш што галодны плебс на Ру Нёв альбо Пенсільванія-авеню для вярхоў капіталістычнай піраміды становіцца больш значнай праблемай, чым намаганні знішчыць моцную ўладу ў Беларусі. Бізнес ужо гатовы, а палітыкі — яшчэ не. Але тое справа часу. Не, вядома, яны будуць фінансаваць здраднікаў. На перспектыву. Але здраднікі ўсё меней і меней будуць трапляць у палітычныя навіны. І не выключэнне, што іх можна будзе ўбачыць толькі ў крымінальнай хроніцы. Грызня за гранты ўжо пачалася. Кропкі над беларускім «і» расстаўлены.

Беларускай апазіцыі больш не існуе. У замежжы засталіся грантасосы. У нашай краіне — падсудныя. За спробу дзяржаўнага перавароту. За намер забіваць. За спаленыя дамы і машыны. Скажаце, што пастаноўка. А вы паслухайце запісы і згадайце відэа. Усё было, як і раней, у 1990-я. Дэталі, падрабязнае абмеркаванне роляў і ганарараў. Заказчык, пасрэднік, выканаўцы, нават спроба падкупіць «вялікія пагоны». Толькі гаворка ішла не пра бізнесмена і «прыхватызацыю» кампаніі — дамаўляліся аб забойстве кіраўніка дзяржавы і як лепш «адціснуць» цэлую краіну. «Мы — мірныя» — памятаеце надпіс з барыкад каля сталічнай крамы «Рыга»? Калі камянямі і «кактэйлямі Молатава» не дамагліся ўлады. Калі маршы збочылі з праспектаў сталіцы, а шарпаўскія тэхналогіі ў барацьбе за перамены саступілі дыялогавым пляцоўкам, за справу ўзяліся яшчэ больш «мірныя»...

Такая вось «інтэлігенцыя пратэстаў» — Юрый Зянковіч, Аляксандр Фядута, Рыгор Кастусёў, Вольга Галубовіч і Дзяніс Краўчук. Яны добра так «адзначыліся» ў інтэрнэце. Не адкруцішся. Першае пытанне: што ў кампаніі апазіцыйнага спрута рабіў псіхіятр з Амерыкі? Аказваў прафесійную дапамогу падчас групавога сеанса «зум-канферэнцыі». Так, «хворых» на вірус знішчэння там хапіла. Для захопу ўлады па сілавым сцэнарыі змоўшчыкі планавалі прыцягнуць каля пяці батальёнаў вайскоўцаў і былі гатовыя знішчаць мірнае насельніцтва. Хіба вы не чулі? У сваіх жа паказаннях падсудныя пацвердзілі інфармацыю з відэа- і аўдыёносьбітаў. Ішла падрыхтоўка да забойства Аляксандра Лукашэнкі.

А цяпер уявіце, што было б з тымі, хто кожны дзень працуе на карысць краіны. Вас гэта не датычыць, і лёс краіны таксама? Закранула б, калі людзі розных палітычных поглядаў пачалі б «вырашаць» свае рознагалоссі вельмі неверагодна... А падчас сапраўднай беларускай «бучы» героі вулічных баёў і крымінальнага эпасу распачалі б «паляванне» на трафеі: прыгожых жанчын і дарагія рэчы. І наўрад ці яны б цікавіліся ў сваіх ахвяр ступенню «неверагоднасці» альбо колькасцю лайкаў пад карцінкамі з пратэстаў.

Толькі балючы плач па зняважаных і забітых ніхто ў ааанаўскім Савеце па правах чалавека не пачуў бы. Як не чуюць ужо восем гадоў запар бамбардзіроўкі Данбаса. Мы былі б ахвярамі не таго сорту. Тое была б звычайная дэмакратычная «цішыня». «Цішыня» — менавіта так назвалі аперацыю па знішчэнні Прэзідэнта. А мы думалі, усё — пратэсты скончыліся, можна лёгка дыхаць свежым і мірным паветрам Беларусі. А менавіта ў той час і рыхтавалася забойства — таго, хто з'яўляецца гарантам усяго, што мы сёння маем.

Дарэчы, сведкам выступае той самы Пратасевіч. Чуў і ведаў. Што яшчэ раз даказвае: усе яны там адным брудам запэцканыя. «Мірныя», «неверагодныя», «змагары», збеглыя — усе яны асобы, твары крывавага мяцяжу. А пры такой «гаджэтызацыі» няўжо аб гэтых перагаворах не ведалі спецслужбы Польшчы і ЗША?

І вось што цікава. Выканаўцам павінен быў стаць, на жаль, добра вядомы ўсім Мікалай Аўтуховіч. «Калекцыянер» зброі і аматар турнэ ва Украіну. Аўтуховіч нават адмовіўся есці. Але добра, што ў турэмных камерах ёсць відэаназіранне. Там вельмі дакладна відаць яго «галадоўку». А тое, што ён не займаўся пазёрствам і ўсё было ўсур'ёз, зразумела па яго неверагодных учынках на малой радзіме. Пакінуў пасля сябе след маштабу прыслужнікаў Дырленвангера. Спаліў хату і машыну свайго земляка. Яны не варагавалі паміж сабой. Усё, што ён ведаў пра пацярпелага, дык гэта толькі тое, што той — міліцыянер. Дарэчы, звычайны праваахоўнік. Хату тую, як кажуць, чалавек будаваў гаспадарчым спосабам са сваіх мазалёў разам з бацькам і цесцем не першы год. А машына тая таксама зусім не новая была... Афіцэру ў цяжкай сітуацыі дапамаглі калегі з усёй вобласці. Вось вам і мараль.

Тыя, хто жадаў пабудаваць «новую» Беларусь («новы парадак» — нічога не нагадвае?) — палілі, разбуралі, рыхтаваліся забіваць. У падсуднага крымінальных эпізодаў хапае. А прыклад пра хату прывёў наўмысна. Каб да ўсіх дайшло. Дом, які мы ўсёй талакой пабудавалі па-гаспадарску, разам з бацькам, хацелі падпаліць. І які ж ваш маральны прысуд, беларусы, у гэты насамрэч момант ісціны? Але ўсе кропкі ў гэтай справе паставіць закон. Таўшчэзную кропку ў існаванні вар'яцкага мяцежнага спрута. У іншым выпадку было б шматкроп'е ў некралогу па Беларусі.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

Падрабязнасці

# Ад калійных угнаенняў да Балівуда

## Чым адметнае беларуска-індыйскае супрацоўніцтва?

**У Індыі і Беларусі прадстаўнікі кіраўніцтва краін і бізнесу актыўна шукаюць шляхі пераадолення цяжкасцяў ва ўзаемным гандлі, выкліканых наступствамі пандэміі і санкцый. Аб гэтым заявіў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Індыі ў Беларусі Алок Ранджан Джа, паведаміла БелТА.**

Дыпламат перакананы, што асноўнай роляй пасла з'яўляецца развіццё і ўзмацненне эканамічных адносін з краінай знаходжання. Што да такога супрацоўніцтва паміж Індыяй і Беларуссю, то яно з году ў год застаецца на ўзроўні каля паўмільярда долараў. Так, у 2021-м двухбаковы тавараабарот склаў $567 млн. «Лічба для нашых краін не такая ўжо вялікая, яна значна ніжэйшая за патэнцыял, які ёсць паміж Беларуссю і Індыяй», — лічыць пасол.

Найбольшую частку экспарту з Беларусі ў Індыю традыцыйна складаюць пастаўкі калійных угнаенняў, на другім месцы — азотныя ўгнаенні, далей — сыравіна для шын, некаторыя віды сталі. Індыя ў асноўным пастаўляе ў Беларусь медыцынскія прэпараты, сыравіну для тытунёвых вырабаў, прадукты перапрацоўкі тытуню, баваўняную пражу, электратрансфарматары, чай, каву, рыс, некаторыя нейлонавыя прадукты.

Як растлумачыў Алок Ранджан Джа, у такіх сферах, як фармацэўтыка, машынабудаванне, сельгасмашынабудаванне, абаронны комплекс, супрацоўніцтва краін развіваецца даўно і стабільна. А вось у такіх галінах, як інфармацыйныя тэхналогіі, інтэрнэт рэчаў, прамысловасць, пасол бачыць вялікі патэнцыял для будучага ўзаемадзеяння.

Праўда, як прызнаецца кіраўнік дыпмісіі, яму бывае цяжка пераканаць індыйскіх бізнесменаў супрацоўнічаць з Беларуссю, бо краіна ім здаецца вельмі маленькай: «Яны не бачаць вялікай цікавасці, бо маштабы несупастаўныя з індыйскімі. І мая галоўная задача — растлумачыць, што Беларусь — гэта вароты, што праз Беларусь яны могуць выйсці на буйнейшыя рынкі».

Паўплывалі на гандаль паміж краінамі і цяжкасці, выкліканыя наступствамі пандэміі і санкцый. Усё гэта негатыўна адбілася на лагістыцы, выклікала цяжкасці з правядзеннем плацяжоў. «Але наш урад і прадстаўнікі бізнесу ўзаемадзейнічаюць, каб знайсці выйсце з сітуацыі», — заўважыў пасол. Тое ж, паводле яго слоў, адбываецца і ў Беларусі. Напрыклад, улады краіны разам з вытворцам і пастаўшчыком калійных угнаенняў шукаюць альтэрнатыўныя шляхі дастаўкі тавару ў Індыю пасля забароны на вываз з порта Клайпеды. «Гэтыя новыя выклікі ўтрымліваюць наш тавараабарот на ўзроўні значна меншым за яго сапраўдны патэнцыял», — са шкадаваннем заўважыў Алок Ранджан Джа.

Пасол падкрэсліў, што турызм паміж Беларуссю і Індыяй мае вялікі патэнцыял, які пакуль увогуле не рэалізаваны. Натуральна, у апошнія гады вялікія страты індустрыі падарожжаў нанесла пандэмія, але нават у даковідныя часы колькасць турыстаў з Індыі ў Беларусі была вельмі сціплай — каля 10 тысяч чалавек у год. А адзінае месца, якое цікавіць большасць беларускіх падарожнікаў у Індыі, — Гоа. «Гэта трэба змяняць», — перакананы Алок Ранджан Джа.

Адзін са спосабаў прыцягнуць у Беларусь індыйскіх турыстаў — зняць тут балівудскі фільм, лічыць пасол. Паводле яго слоў, калі ў Індыі глядзяць папулярны фільм, людзі абавязкова жадаюць пабываць там, дзе праходзілі здымкі. «Буду старацца пераканаць прадзюсараў зняць тут фільм. Цяпер гэта крыху складана, але як толькі сітуацыя нармалізуецца, буду пераконваць прыязджаць сюды, глядзець лакацыі і здымаць кіно», — сказаў кіраўнік дыпмісіі.

Гаворачы ў цэлым аб развіцці міжасобасных кантактаў і супрацоўніцтве ў гуманітарнай сферы, ён з задавальненнем адзначыў вялікую цікавасць беларусаў да індыйскай культуры, музыкі, традыцый. Акрамя таго, развіваецца і супрацоўніцтва ў сферы адукацыі. У Беларусі займаюцца каля тысячы студэнтаў з Індыі, пераважна яны вывучаюць медыцыну, але ёсць цікавасць і да іншых спецыяльнасцяў. Пасол таксама расказаў аб наяўнасці кароткатэрміновых праграм для навучання беларусаў у Індыі, якія падтрымліваюцца ўрадам гэтай краіны.

**Захар БУРАК.**


**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Общества с ограниченной ответственностью «Гомельская Инжиниринговая Компания» – управляющая компания холдинга «Стройинжиниринг Групп», в лице ликвидатора – директора Общества с ограниченной ответственностью «Модель антикризисного управления» Куценковой Натальи Степановны, извещает о проведении 31 августа 2022 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 10 % по продаже имущества в 11.00 часов в городе Гомеле по улице Гагарина, 20**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **Местонахождение (лоты №№ 2-12):** г. Гомель, ул. Малайчука, 12 | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 210/С-11497**, площадью **118,00 кв. м**, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – **магазин.** Составные части и принадлежности: склад. Адрес: Витебская обл., Браславский р-н, Межанский с/с, 16, вблизи д. Усяны. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **220885615401000067** общей площадью **0,0757 га (право постоянного пользования). Адрес:** Витебская обл., Браславский р-н, Межанский с/с, 16, вблизи д. Усяны. **В состав лота № 1 входит:** Банная печь «Емеля», бойлер, деревянный туалет, душевая кабина (2 шт.), конвектор электрический ENGY EN-1500 Energo (2 шт.), кровать двуярусная (10 шт.), микроволновая печь (2 шт.), накопительный водонагреватель, наматрацник (тюфяк) 186x70x7 (20 шт.), насос-гидрофор 24 л, огнетушитель порошковый ОП-10, печь отопительная металлическая, печь отопительная металлическая, печь отопительная металлическая, плита газовая, стиральная машина (2 шт.), холодильник (2 шт.), чайник электрический, шкаф металлический (7 шт.), электрическая настольная плита (2 шт.) | 29 192,40 | 2 919,24 |
| 2 | Станок для резки блоков Белмаш MCS-400, 2020 года выпуска, инв. № 00000025 | 1 836,00 | 183,60 |
| 3 | **Автомобиль LADA 21703**, рег. № 8064 ЕН-6, 2010 года выпуска, тип ТС – легковой седан, тип двигателя – бензиновый, МКПП | 2 160,00 | 216,00 |
| 4 | **Автомобиль VAZ 21723**, рег. № 9290 КЕ-3, 2009 года выпуска, тип ТС – легковой хэтчбек, тип двигателя – бензиновый, МКПП | 5 292,00 | 529,20 |
| 5 | **Автомобиль ВАЗ 21703**, рег. № 0320 BI-6 (6EIT4218), 2008 года выпуска, тип ТС – легковой специальный седан, тип двигателя – бензиновый, МКПП | 3 888,00 | 388,80 |
| 6 | **Автомобиль VAZ 21713 120-01**, рег. № 9920 КЕ-3, 2011 года выпуска, тип ТС – легковой универсал, тип двигателя – бензиновый, МКПП | 7 236,00 | 723,60 |
| 7 | **Автомобиль VAZ 21703**, рег. № 1058 КМ-3, 2012 года выпуска, тип ТС – легковой автомобиль седан, тип двигателя – бензиновый, МКПП | 6 048,00 | 604,80 |
| 8 | **Автомобиль VAZ 21703**, рег. № 5071 IP-3, 2012 года выпуска, тип ТС – легковой автомобиль седан, тип двигателя – бензиновый, МКПП | 6 048,00 | 604,80 |
| 9 | **Автомобиль FORD TRANSIT**, рег. № 6787 KI-3 (3ТЕ 4569), 1995 года выпуска, тип ТС – легковой вагон, тип двигателя – дизельный, МКПП | 3 996,00 | 399,60 |
| 10 | **Автомобиль FORD TRANSIT**, рег. № 3088 КВ-3, 1997 года выпуска, тип ТС – легковой вагон, тип двигателя – дизельный, МКПП | 5 076,00 | 507,60 |
| 11 | **Автомобиль FORD TRANSIT**, рег. № 3671 ЕВ-3, 1992 года выпуска, тип ТС – легковой вагон, тип двигателя – дизельный, МКПП | 3 672,00 | 367,20 |
| 12 | **Прицеп P SIR A514**, рег. № 6555 АА-3, 1991 года выпуска, тип ТС – прицеп специальный караван | 6 048,00 | 604,80 |

**Продавец:** общество с ограниченной ответственностью «Гомельская Инжиниринговая Компания» – управляющая компания холдинга «Стройинжиниринг Групп», 246028, г. Гомель, ул. Малайчука, 12. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: **8 (029) 611-98-91 – зам. директора Антон Александрович.** **Шаг аукционных торгов –** 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. **Для участия в аукционе необходимо: 1)** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); 2)** подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 18 августа 2022 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 29 августа 2022 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденное постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607). **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 15.07.2022 № 137 (29759). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16.**

Год гістарычнай памяці

# «МЯНЕ ЗНАЙШЛІ, ВАМ ХУТКА ЎСЁ РАСКАЖУЦЬ АБ НАС, ХТО ЗНІК БЕЗ ВЕСТАК НА ВАЙНЕ...»

**Раны Вялікай Айчыннай вайны не могуць загаіцца і сёння. Стогне зямля, час ад часу выцясняючы на паверхню неразарваныя снарады, прабітыя кулямі сапёрныя лапаткі, а яшчэ — астанкі салдат, якіх у лясах і на палях нашай краіны яшчэ ляжыць нямала. І праз 80 гадоў пасля гібелі героям вяртаюць імёны і з ушанаваннямі адпраўляюць у апошні шлях нераўнадушныя людзі — пошукавікі.**



Мне выдалася магчымасць правесці дзень разам з удзельнікамі міжнароднай Вахты Памяці, якая праходзіла на тэрыторыі Заронаўскага сельсавета ў Віцебскім раёне. Гледзячы на знаёмага, які ўсё жыццё займаецца пошукам і ўдзельнічае ва ўсіх экспедыцыях незалежна ад загружанасці асабістымі справамі і надвор'я, мне таксама заўсёды хацелася далучыцца да іх, «байцоў нябачнага фронту». І вось нарэшце ў жніўні, на другі дзень пасля афіцыйнага адкрыцця пошукавай экспедыцыі, мне патэлефанавалі: прыязджай, паднімаем, дзесяць...

Вёска Пестуніца, збочваю з цэнтральнай вуліцы налева. За апошнім домам працякае рэчачка. Менавіта тут, на яе берагах, знайшла хлопцаў. Перад вачыма вялікая, як ад снарада, яміна, у ёй — мой знаёмы Стас кістачкай расчышчае ад зямлі астанкі апошняга, ужо дзясятага па ліку байца. Маўчу, унутры змешваюцца два пачуцці: першае — жах, а следам — трапяткое адчуванне «знайшлі!». Не ведаю, што адчуваюць ужо бывалыя мужчыны-пошукавікі ў такія моманты. Можа, тое ж самае, проста стрымліваюцца і не падаюць віду перад дзецьмі.

Я здзівілася, што так хутка пасля пачатку экспедыцыі з'явіліся першыя знаходкі, але пошукавікі ўжо напярэдадні нашай сустрэчы паднялі ў Сімонаўскім лесе яшчэ семярых. Была разам з салдатамі ў зямлі зброя, рэшткі напалову заржавелых боепрыпасаў, нейкія асабістыя рэчы, але ні аднаго медаля ці медальёна, па якіх было б магчыма устанавіць імёны. Праўда, гісторый з добрым канцом, калі па медалі, напрыклад, «За адвагу», знаходзілі родных загінулага воіна і перадавалі ім узнагароду, таксама хапае ў беларускіх энтузіястаў-пошукавікаў. Сёлета пошукавікі Беларусі і Расіі адзначаюць 15-годдзе супрацоўніцтва, за гэтыя гады было праведзена шмат вахтаў на тэрыторыі Віцебскага раёна, вернуты з небыцця дзясяткі імёнаў і перапахаваны ў брацкіх магілах больш чым тысячу салдат, але нястомна, двойчы на год, яны збіраюцца разам, бо цвёрда ўпэўнены, што вызваліцеляў, якія засталіся ляжаць у безыменных магілах на беларускай зямлі, яшчэ вельмі шмат.

Расіяне ўваходзяць у склад Маскоўскай абласной грамадскай арганізацыі «Благачынны ваенна-гістарычны пошукавы клуб «Памяць і прымірэнне», нашы — у Віцебскі абласны гісторыка-патрыятычны пошукавы клуб «Полымя». Усе яны — добраахвотнікі. Гэта людзі абсалютна розных прафесій, якія ў вольны ад асноўнай працы час займаюцца пошукам, які патрабуе не толькі сіл і цярпення, але і вялікіх укладанняў. Металашукальнікі — іх я налічыла трох розных відаў, рыдлёўкі, спецвопратка, розныя прыстасаванні... Што кіруе імі? Я пазнаёмілася з Дзімам, ён масквіч, працуе ў сувязі. Шчаслівая сям'я, дзеці — усё, як мае быць. Але ўсё роўна ён дзеліць свой водпуск па два тыдні на красавік і жнівень — як правіла, Вахту Памяці праводзяць вясной і ўлетку, — і едзе на асабістым аўтамабілі ў Беларусь. «За сваё жыццё я шмат чаго пабачыў: быў у Еўропе, плаваў у моры. Свайго адпачынку я не шкадую, бо цвёрда ўпэўнены, што наша работа — гэта абавязак усіх жывых перад загінулымі», — расказвае мужчына. Разам з дарослымі працуюць і дзеці — у мінулым годзе да навучэнцаў кадэцкага класа Маскоўскай школы № 760 імя Марэсьева далучыліся кадэты з Полацка. Гэта новы імпульс у міжнародным патрыятычным выхаванні моладзі дзвюх краін.

Яны не шукаюць камфортных умоў для сябе — людзі прыязджаюць працаваць. Мяккую канапу ім на дзесяць дзён замяняе спальны мяшок, душ — празрыстае возера, а каша, звараная на кастры, з'яўляецца найвялікшай смакатой. «Школа жыцця» — так называюць звыклыя да палявых умоў мужчыны лагер для кадэтаў. Тут змайстравалі нават палявую лазню. Складана толькі, што ніхто фінансава не дапамагае: і прадукты харчавання, і бензін на дарогу ад Масквы да Віцебска і назад аплачваюць сваімі сіламі. Але, прызнацца шчыра, ніхто і не звяртае ўвагі на грашовыя моманты — мэта вахты зусім іншая.

Пасля раскопак у Пестуніцы пераязджаем у Шаркі. Адзіным напамінам аб ваенных дзеяннях у гэтай мясцовасці з'яўляецца брацкае пахаванне з класічнай чырвонай зоркай на абеліску. Вакол — палі, лес і цішыня... Дзень гэты выдаўся надзвычай спякотным, як амаль і ўсе папярэднія дзесяць дзён экспедыцыі. Пошукавік Станіслаў расказвае аб падрыхтоўцы да Вахты Памяці і расцілае перада мной чорна-белыя, на першы погляд не вельмі зразумелыя, карты. Гэта аэрафотаздымкі з самалётаў нямецкай разведкі, якія за вялікія грошы нашы пошукавікі выкупляюць у амерыканскіх архівах. З дапамогай праграмы здымак накладваецца на сучасную карту мясцовасці, і па ім можна ўбачыць, дзе ішлі баі. Уважліва гляджу на карту: няма ніякіх абазначэнняў, крыжыкаў і кругоў, толькі купкамі рассыпаныя агеньчыкі, якіх у некаторых месцах занадта многа. Не разумею, затое хлопцы побач памайстэрску вызначаюць наша месцазнаходжанне і складаюць далейшы маршрут.

Спачатку па абраным участку тэрыторыі праходзяць з «рамай» — металашукальнікам з шырокім ахопам у выглядзе квадрата, які трымаюць двума рукамі на ўзроўні ног. Пасля — праходзяць па месцы, дзе больш звініць, кругавым. І толькі потым пачынаюць капаць маленькімі групамі па двачатры чалавекі ў некалькіх кутках. У яме вузка, цяжка развярнуцца нават аднаму, таму і пошукавікі змяняюць адзін аднаго. На зямлі з'яўляюцца першыя знаходкі: счарнелыя ад часу кулі, калючы дрот. Яшчэ трохі глыбей — паказаўся стул, зроблены з пня. «Бліндаж» — кажуць хлопцы. Мо так і ёсць, бо ўчастак зямлі «звініць» адной прамой стужкай. Тым часам да невыноснай спякоты далучыліся яшчэ камары з аваднямі, адмахваючыся, працягваюць капаць да самага вечара, толькі напрыканцы дня ўдаецца схапіць кароткія подыхі перадначнога ветру.

У межах Вахты Памяці прайшло перапахаванне астанкаў 108 байцоў у Навіках, якіх паднялі падчас экспедыцыі ў красавіку-маі на тэрыторыі Шапечынскага сельсавета. Асабіста для мяне ў пошукавікоў ёсць кранальная традыцыя, якая на кожным падобным мерапрыемстве шчыміць сэрца. Адпраўляючы праз такі доўгі прамежак часу байцоў у апошні шлях, каля свежай брацкай магілы ўсе ўдзельнікі вахты кладуць на пагорак далоні ў поўнай цішыні. Я спытала ў знаёмага, навошта: «Грэем хлопцам зямлю», — адказалі мне. Так... Не дзеля пафасу і ўсеагульнага прызнання. Гэта проста вынік цяжкай і бясконцай работы, асэнсаванне таго, што ўсё — недарэмна.

За дзесяць жнівеньскіх дзён на віцебскай зямлі пошукавікі паднялі астанкі 50 байцоў, якія загінулі пры вызваленні горада на тэрыторыі Заронаўскага сельсавета. Яны з воінскімі ўшанаваннямі будуць перапахаваны на Заронаўскім мемарыяле побач з 10,5 тысячы салдат, якія ўвекавечаны тут. Будучай вясной пошукавікі зноў збяруцца на беларускай зямлі, аддаючы даніну памяці воінам-вызваліцелям.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.**

# ПАМІЖ ДОБРУШАМ І ЗАПАЛЯР'ЕМ

**На Гомельшчыне, недалёк ад Добруша, за тры гады да рэвалюцыі ў сям'і Добшыкавых нарадзіўся сын Барыс. Адзін з шасцярых дзяцей годна вывучыўся, атрымаў медыцынскую адукацыю. У 25 гадоў маладога чалавека з беларускай глыбінкі прызвалі на савецка-фінскую вайну, а ў 1941-м — адразу на Вялікую Айчынную. Двое яго братоў вярнуліся з фронту. Барыса ж бацька з маці так і не дачакаліся. Лічыўся прапаўшым без вестак. Іх сын так і не стаў ні мужам, ні бацькам, ні дзедам. Яго фотакартка, зробленая яшчэ на «грамадзянцы», захавалася ў сям'і пляменніцы. Гэты партрэт праз 80 гадоў дапамог прасякнуцца дзіўнай гісторыяй лёсу героя. Весткі аб ім на Гомельшчыну прыйшлі ажно з Запаляр'я.**



Менш за месяц таму, падчас пошукавай экспедыцыі ў раёне возера Чэрап у Мурманскай вобласці, астанкі салдата часоў Вялікай Айчыннай вайны былі падняты ўдзельнікам пошукавага атрада Аляксандрам Магданавым. Сам ён родам з Гомельскага раёна. Можна толькі ўявіць, што перажыў пошукавік, калі там жа знайшлі чорную эбанітавую шасцігранную капсулу — смяротны медальён. У ім цудоўна захаваўся папяровы ўкладыш. Аказалася, «адшуканы» праз 80 гадоў баец Чырвонай Арміі быў земляком. У смяротным медальёне, акрамя прозвішча Барыс Добшыкаў, былі ўказаны прозвішча яго маці і адрас — вёска Івакі Церахоўскага раёна. Гісторыя раскруцілася вокамгненна.

— Для пошукавікаў узняць астанкі героя Вялікай Айчыннай, пры якіх захаваўся не пусты смяротны медальён, — нечуваная радасць. Вядома, што на фронце многія спецыяльна не ўпісвалі ў такую запіску сваё імя. Лічылася, што, калі зробіш гэтак, цябе дакладна заб'юць, — тлумачыць **асістэнт кафедры філасофіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны Павел ЖДАНОВІЧ.** — Рэдка здараецца, што пошукавікі знаходзяць фрагменты медальёна, але ён у такім стане, што пры найменшым доступе кіслароду запіска з імем байца ператвараецца ў пыл. Ці другое: пашанцавала — паднялі байца, ёсць медальён, чытаецца, але сваякоў так і не знаходзяць.

З ваенным гісторыкам Паўлам Ждановічам сустракаемся ў гомельскім дзяржуніверсітэце невыпадкова. Менавіта Павел Леанідавіч з вядучым спецыялістам інфармацыйна-аналітычнага аддзела ГДУ імя Ф. Скарыны Людмілай Дуброўскай дапамаглі тэрмінова адшукаць родных знойдзенага ў Мурманскай вобласці байца. Значна дапамог пошукавікам на самым пачатку дакладна разабрацца з данымі смяротнай запіскі, дарэчы, і пазаштатны фатограф газеты «Звязда» Андрэй Феакціставу. Менавіта ён перасланы з Мурманскай вобласці здымак з данымі байца прафесійна апрацаваў, аднавіў пажоўклы кавалак паперы ў спецыяльнай праграме.

— У падобных выпадках даныя салдата правяраюцца па базе, — тлумачыць Андрэй Феакціставу. — Але цяпер яна нічога не выдала, бо ў канкрэтным выпадку ў базе прозвішча Добшыкаў было ўказана з памылкай у адной літары. Не супадала і дата смерці, быў паказаны 1943 год, пры гэтым у 43-м эбанітавы цыліндры — смяротныя медальёны ўжо не ўжываліся, а былі заменены на чырвонаармейскія кніжачкі. Вельмі дапамагло тое, што ў запісцы з медальёна выдатна чыталася прозвішча маці байца і адрас, — дадае фотакарэспандэнт.

Цікава, як гісторыя пошукаў прапаўшага без вестак байца ў адно імгненне змагла аб'яднаць самых родных людзей.

— Мяне за дзве тысячы кіламетраў адшукалі калегі-пошукавікі з Мурманска, — прадстаўляецца спецыяліст па рабоце з моладдзю Мурманскага рэгіянальнага цэнтра патрыятычнага выхавання і дапрызыўнай падрыхтоўкі моладзі Вольга Яўсеенка.

Цэнтр, дзе яна працуе, непасрэдна курыруе дзейнасць усіх пошукавых атрадаў падчас экспедыцыі на тэрыторыі Мурманскай вобласці. Калегі ведаюць, што Вольга Яўсеенка сама беларуска і ў адпачынак кожнае лета едзе ў родны Гомель. Яна таксама далучылася да пошуку родных загінулага героя.

— Кольскі паўвостраў — гэта граніца з Фінляндыяй і Нарвегіяй. Падчас Вялікай Айчыннай — гэта тэрыторыя масіраваных бамбардзіровак і адно з месцаў, дзе не была пяройдзена граніца Савецкага Саюза, чаму Мурманск і атрымаў званне «Горад-герой». Тэрыторыя — тундралесатундра, суцэльныя камяні, баі былі вельмі цяжкія. Хавалі салдат пасля бою, проста прывальваючы камянямі. У 1958 годзе ў нас пачалі ўтварацца пошукавыя атрады пры прадпрыемствах. Гэта значыць, людзі ў свой выхадны выязджалі ў сопкі, каб падняць астанкі загінулых. Так утварыўся маштабны мемарыяльны комплекс «Даліна Славы» — маштабныя могілкі, заснаваныя пошукавікамі. Менавіта там штогод адкрываем вахты памяці, праводзім пахаванні салдат, астанкі якіх былі падняты. Ёсць практыка ўрачыстай адпраўкі астанкаў герояў на іх малую радзіму, — тлумачыць Вольга Яўсеенка.

У ГДУ ўсе, хто дапамагаў праліць свет на гэту гісторыю, сустрэліся ўжо з нашчадкамі загінулага героя Барыса Добшыкава — роднай пляменніцай Тамарай Уладзіміраўнай Адначка, яе дачкой Вольгай і ўнукам Міхаілам Канавальчыкамі. Юнак, дарэчы, вучыцца ў медыцынскім універсітэце. Кажа, што медыкам быў прадзед Барыс.

— Ён родны брат маёй мамы, — расказала Тамара Уладзіміраўна. — Мы ведалі, што ён прапаў без вестак, і інфармацыю ніякую аб ім не шукалі. Бабуля заўжды казала, што яе Барысам усе ў вёсцы ганарыліся, казалі, інтэлігент, мэтанакіраваны чалавек. Спадзяваліся родныя, што зможа дабіцца шмат чаго ў жыцці. Дзіўна, але мой дзед (бацька Барыса) быў дыяканам у царкве. Яе закрылі, але дома ў яго вельмі шмат абразоў было. Дык дзед кожны дзень пачынаў з малітвы і за без вестак зніклага воіна Барыса. Да мяне ад бабулі і дзядулі перайшоў спіс маіх продкаў, за якіх трэба заўжды маліцца. Такі наказ мне, значыць, далі: каб на Барыса ніколі не забывалася ў малітвах перад Богам. Вось як бывае.

Тамара Уладзіміраўна расказала, як у сям'і адрэагавалі на навіну з Мурманска. Кажа, што ніхто не мог падумаць, што праз столькі гадоў у іх сям'ю прыйдзе такая вестка. Цікава, што самы малодшы брат Барыса пасля вайны застаўся менавіта ў Мурманску: служыў у Паўночна-марскім флоце, потым і яго сын стаў вайскоўцам. Але сувязь з імі ў сваякоў з Гомельшчыны пасля згубілася. Можа, гэта гісторыя дапаможа сем'ям адшукаць адзін аднаго.

Пакуль жа па дамоўленасці са спецыялістам па рабоце з моладдзю Мурманскага рэгіянальнага цэнтра патрыятычнага выхавання і дапрызыўнай падрыхтоўкі моладзі Вольгай Яўсеенкай будзе прапрацоўвацца пытанне ўрачыстай адпраўкі астанкаў загінулага героя Барыса Добшыкава на Гомельшчыну. Будзем сачыць за гэтай гісторыяй.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.**



Пафестывалім!

# Хэдхантар, касманаўт, эколаг, стрымер...

Больш за 60 прафесій асвояць дзеці на сямейным фестывалі «Букідс»



**Гэтыя выхадныя ў Цэнтральным батанічным садзе сталіцы стануць пляцоўкай для актыўнага і карыснага дзіцячага адпачынку. 20 і 21 жніўня тут пройдзе свята «Букідс. Прафесіі», якое завершыць летнюю фестывальную сесію «Букідс».**

Стаць банкірамі, фларыстамі, кандытарамі, мадэлямі, стаматолагамі, ратавальнікамі, самелье, дэгустатарамі, мастакамі, хэдхантарамі (шукальнікамі талентаў) і яшчэ шмат кім малыя змогуць на працягу двух дзён. Заробленую за асвоеную прафесію фестывальную «валюту» — букідсы — дзеці змогуць абмяняць на тавары ў фестывальных крамах ад анлайн-гіпермаркета 21vek.by і Мінскага завода безалкагольных напояў ці аплаціць імі разнастайныя фестывальныя забаўкі.

Дарэчы, будзе працаваць кінатэатр, дзе пакажуць мульцікі, а відэасэрвіс VOKA пазнаёміць малых з прафесіямі кінаіндустрыі. У «Сакавітым садзе» — на музычна-тэатральнай пляцоўцы фестывалю — два дні з дзесяці раніцы да сямі вечара будуць даваць спектаклі. А вечарам з 19:00 да 22:00 тут адбудзецца забаўляльна-музычная праграма.

Цікавыя майстар-класы правядуць рамеснікі ў зоне «Гарошак Маркет», дзе можна будзе таксама набыць дызайнерскія вырабы майстроў. А на пляцоўцы «Офістон Маркет» з пяці да сямі вечара на працягу двух дзён пройдзе свята холі (ахвотныя змогуць «паваяваць» рознакаляровымі пакецікамі з фарбамі). Для самых маленькіх гасцей і іх мам запрацуе дзіцячая пляцоўка са спавівальнай зонай і месцам для кармлення немаўлят.

Падмацаваць сілы прапануецца ў зоне фуд-корта «Усё сваё». А юныя бізнесмены змогуць папрацаваць за сапраўдныя грошы на «Дзіцячым маркеце» — у бізнес-школе для юных прадпрымальнікаў. Тут малыя будуць гандляваць уласнымі вырабамі: печывам, малюнкамі ці сувенірамі, а таксама кнігамі і цацкамі. Каб стаць прадаўцом, трэба папярэдне даслаць заяўку на пошту фестывалю bookids.press@gmail.com.

Дзеці да 12 гадоў могуць наведаць фестываль бясплатна. Падлеткі да 17 гадоў — за шэсць рублёў, дарослыя — за 18. Аднак найбольш выгадна прыходзіць усёй сям'ёй — для двух дарослых і дзіцяці квіток каштуе 30 рублёў.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

На ўсе рукі

# ЭКЗАМЕН ДЛЯ САПРАЎДНЫХ МАЙСТРОЎ

**Еўразійскі чэмпіянат прафесійнага майстэрства пройдзе ў Расійскай Федэрацыі ў верасні. Яго ключавая задача — атрыманне краінамі новых уменняў і вопыту з мэтай далейшага маштабавання гэтых практык і тэхналогій для ўдасканалення сваіх нацыянальных сістэм падрыхтоўкі кадраў. Правядзенне чэмпіянату будзе садзейнічаць развіццю прафесійных супольнасцяў і сінхранізацыі стандартаў прафесійнай падрыхтоўкі па найбольш запатрабаваных і перспектыўных для еўразійскіх краін рабочых прафесіях, а таксама фарміраванню і ўкараненню міжнацыянальнай сістэмы незалежнай ацэнкі і прызнання кампетэнцый.**

У рамках Еўразійскага чэмпіянату 2022 у перыяд з 15 да 19 жніўня ў Маскве пачынаюцца спаборніцтвы па асобных кампетэнцыях.

У конкурсе прафесійнага майстэрства ад Рэспублікі Беларусь па кампетэнцыі «Сухое будаўніцтва і тынкоўчныя работы» прыме ўдзел канкурсант Максім Варажбіт, уладальнік залатога медаля рэспубліканскага чэмпіянату прафесійнага майстэрства 2020 года, выпускнік філіяла РІПА «Індустрыяльна-педагагічны каледж», цяпер малады спецыяліст — майстар вытворчага навучання ў Мінскім дзяржаўным прафесійным ліцэі № 12 будаўніцтва. У складзе нацыянальнай каманды — і эксперт Аляксандр Іўчанка, кіраўнік службы маркетынгу ААТ «Белгіпс».

У кампетэнцыі «Цагляны мур» Беларусь прадставяць педагагічныя работнікі Мінскага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя № 5 транспартнага будаўніцтва — канкурсант Раман Ціхановіч, выпускнік ліцэя, уладальнік залатога медаля рэспубліканскага чэмпіянату прафесійнага майстэрства ў 2020 годзе, а цяпер малады спецыяліст, майстар вытворчага навучання, і эксперт Уладзімір Дудараў — тытулаваны майстар вытворчага навучання з багатым вопытам удзелу ў конкурсным руху.

Афіцыйная цырымонія адкрыцця чэмпіянату адбудзецца 8 верасня ў Саранску. (Рэспубліка Мардовія). Асноўнай пляцоўкай стане «Саранск-Арэна». Плануецца, што ў вочным фармаце выступяць амаль 100 удзельнікаў і прадстаўнікоў экспертнай супольнасці з краін еўразійскай прасторы. І больш за 200 замежных канкурсантаў і экспертаў прымуць удзел у чэмпіянаце на адлегласці. Экспертаў, майстроў вытворчага навучання і выкладчыкаў, якія рэалізоўваюць праграмы прафпадрыхтоўкі, апроч спаборніцкай часткі, чакае вялікі блок па прафесійным і метадычным навучанні.

У склад каманды Рэспублікі Беларусь уваходзяць пераможцы адборачных этапаў і прызёры IV Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства 2020 года.

Рэалізацыя праграмы чэмпіянату прадугледжана ў дыстанцыйна-вочным фармаце з прымяненнем размеркаваных пляцовак у краінах еўразійскай прасторы. Зборная Беларусі ўдзельнічае ў 19 кампетэнцыях: 12 з іх — у вочным фармаце і 7 кампетэнцый арганізаваны ў дыстанцыйным фармаце.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# Каляровая разметка і новыя знакі

## Першыя два тыдні — самыя складаныя

Да зімовай эксплуатацыі дарог рэспубліканскага значэння дарожнікі пачынаюць рыхтаваць яшчэ летам, а першы кантроль за выкананымі работамі адбываецца 9 верасня. Асноўная задача — падрыхтаваць вытворчую базу, тэхніку і супрацьгалалёдныя матэрыялы ў колькасці, неабходнай для таго, каб пачаць сезон без праблем. Для кіроўцаў і дарожнікаў самыя галоўныя — першыя пару тыдняў, калі пачынаюцца зімовыя ападкі і тэмпература становіцца ніжэй за нуль, заўважыў **Сяргей ЛЯВОНЧЫК, начальнік упраўлення развіцця аўтамабільных дарог галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог Міністэрства транспарту і камунікацый:**

— За гэты час кіроўцам неабходна перабудаваць свае паводзіны на дарозе і стыль ваджэння, а дарожнікам — прыняць прэвентыўныя меры, каб не дапусціць на дарогах слізгаты і галалёдзіцы.

Штогод на дарогі для зручнасці кіроўцаў і пешаходаў наносіцца разметка. Сёлета з запланаваных 350 тысяч м² разметкі нанесена ўжо больш як 300 тысяч. Тыя 15 %, што засталіся, «дамалююць» пасля выканання работ па бягучай замене асфальтабетоннага пакрыцця і работ па тэхналогіі «слары-сіл», то-бок нанясення ахоўных слаёў, падзяліўся **Вячаслаў САВІЧ, дырэктар Спецыялізаванага мантажна-эксплуатацыйнага прадпрыемства Мінгарвыканкама:**

— Падчас работ па тэхналогіі «слары-сіл» выкарыстоўваюцца сучасныя матэрыялы: гарачы пластык і пластыкі халоднага нанясення, асноўныя перавагі якіх — добрая бачнасць, высокая зносастойкасць, эканамічнасць нанясення і ўстойлівасць да рэагентаў.

## Чырвоны — для эстэтыкі, зялёны — для ўвагі

Для паляпшэння эстэтычнага выгляду праспектаў і вуліц сталіцы на накіравальных астраўках па праспекце Незалежнасці, вуліцах Прытыцкага, Кальварыйская, Якуба Коласа, Лагойскі тракт, транспартнай развязцы па праспекце Дзяржынскага нанесена разметка ў выглядзе пластыкаў і эмаляў чырвонага колеру.

А каб прыцягнуць увагу кіроўцаў і веласіпедыстаў — у месцах, дзе абазначаны велапераезды, разметка зроблена з дапамогай пластыкаў і эмаляў зялёнага колеру. Для папярэджання кіроўцы аб небяспецы пры развароце ў месцах размяшчэння трамвайных пуцей дарожнікі нанеслі надпісы «ТРАМВАЙ» са стрэлкай кірунку размяшчэння пуцей — на праспекце Машэрава, Лагойскім і Старавіленскім трактах, вуліцы Якуба Коласа.

Чакаецца, што налета вытворцы матэрыялаў для дарожнай разметкі зробяць яе больш бяспечнай у тым ліку і для матацыклістаў — колы іх транспартных сродкаў пакуль што слізгаюць па ёй падчас і пасля дажджу.

Акрамя таго, транспартнікі працягваюць работу па стварэнні безбар'ернага асяроддзя, эвалюцыяніраванні веласіпеднай структуры з пашырэннем гэтай сеткі і пошуку новых месцаў для арганізацыі руху веласіпедыстаў.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

**Ірына СІДАРОК.**

**Калі вы стаміліся ад гарадскога шуму і мітусні, надышоў час «выбрацца на прыроду». Паняцце «экатурызм» усё больш трывала ўваходзіць у наша жыццё. «Звязда» адшукала, мабыць, найлепшае месца для такога падарожжа.**

# ПОКЛІЧ

## САРДЭЧНА ЗАПРАШАЕМ у запаведны край некранутай прыроды!



Унікальны прыродны аб'ект — маладыя дубровы на пясчаных дзюнах.

## ЧАРОЎНЫ СВЕТ ПРЫПЯЦІ

**У апошнія гады, пачынаючы з пандэмійнага 2019-га, беларусы актыўна адкрываюць для сябе Беларусь. І, напэўна, гэта менавіта той выпадак, калі «не было б шчасця, ды няшчасце памагло». Не раз даводзілася чуць ад самых розных людзей, што замежныя распіяраныя славутасці часам моцна саступаюць тым, што літаральна побач, — і пры гэтым нярэдка чужыя мы ведаем значна лепш, чым свае.**



Генеральны дырэктар ДПУ «Нацыянальны парк «Прыпяцкі» Юрый АПАНОВІЧ.

Дык чаму ж варта дабрацца да Гомельскага Палесся і пабываць у Нацыянальным парку «Прыпяцкі»? Наўскідку можна прывесці мінімум шэсць прычын, але, напэўна, кожны, хто хоць раз адпачываў тут, здольны дадаць да гэтага спіса і ўласныя аргументы. «Прыпяцкі» прыйдзецца даспадобы і сем'ям з дзецьмі, і аматарам гісторыі, і прыхільнікам камфорту, і экстрэмалам, не кажучы ўжо пра паляўнічых і рыбакоў. Але пра ўсё па парадку. Наведаць Нацыянальны парк «Прыпяцкі» варта, каб...

### • Паслухаць «спеў» аленя і адчуць веліч прыроды

Плошча Нацыянальнага парка «Прыпяцкі» — без паўтысячы 200 000 га: то-бок 199 з паловай тысяч. На велізарнай тэрыторыі жыве 258 відаў птушак (56 з якіх занесены ў Чырвоную кнігу) і больш за 60 відаў жывёлін (5 з якіх — чырванакніжнікі).

— Каштоўнасць парку «Прыпяцкі» — у неверагоднай разнастайнасці флоры, фаўны, а таксама прыродных ландшафтаў, якія ўзніклі дзякуючы «беларускай Амазонцы» — Прыпяці. Прыпяцкае Палессе нездарма называюць «лёгкімі Еўропы». Такіх унікальных тэрыторый, якія дайшлі да нашых дзён у сваім спрадвечным выглядзе, няма больш нідзе, — кажа **генеральны дырэктар Нацыянальнага парка «Прыпяцкі» Юрый АПАНОВІЧ.** — Тут адзінае месца ў Еўропе, дзе можна ацаніць іх прыгажосць. Яркі прыклад — пойменныя дубровы. У поўнай меры іх непаўторнасць можна зразумець толькі вясной, калі гэтая тэрыторыя затопленая падчас разліву Прыпяці.



Велічныя поймавыя дубровы нацыянальнага парка.

У красавіку пойменныя дубровы ператвараюцца ў водную роўнядзь: вада падымаецца на 2-3 метры ад узроўню зямлі, і ў ёй стаяць волаты-дубы, некаторыя з якіх адлічваюць сваю гісторыю аж з 18 стагоддзя.

— Гэтай вясной мы адкрылі новы турыстычны напрамак — экскурсію па затопленых пойменных дубровах на байдарках, — расказвае генеральны дырэктар. — У байдарцы чалавек знаходзіцца ў напаўляжачым становішчы, і калі падплываеш да метровага дыяметра дуба і бачыш над сабой, у вышыні, разгалістую крону, любы чалавек адчувае сваю ўразлівасць і веліч прыроды. Неверагодныя адчуванні! Экскурсія аказалася вельмі запатрабаванай. З пачаткам лета з дуброў вада сыходзіць, але ў нас дастаткова іншых цікавых аб'ектаў для водных экскурсій. Гэта сама Прыпяць або, напрыклад, рэчка Сцвіга, або Скрыпіца...

Узровень складанасці маршрутаў — ад «медыум» да «хард», у залежнасці ад фізічнай падрыхтоўкі турыстаў. У любым выпадку, групу суправаджае дасведчаны інструктар, і непрыемныя нечаканасці выключаныя.

На разрыў шаблону і «разбурэнне ганарлівасці» сучаснага гараджаніна працуе і яшчэ адзін новы экскурсійны кірунак.

— Сёлета мы вырашылі даць магчымасць турыстам пабываць на тэрыторыі, дзе гучыць роў аленяў і ласёў. Каб гарадскія жыхары маглі пачуць, сваімі вачыма ўбачыць і, магчыма, зафіксаваць гэту ўнікальную прыродную з'яву, — распавядае Юрый Аляксандравіч.

Алені і ласі равуць у перыяд вяселляў і паядынкаў — дзесьці з 20 жніўня і ўвесь верасень. Ровам яны склікаюць самак і выклікаюць на бой сапернікаў. І гэты гук часам уганяе ў дрыжыкі нават мясцовых жыхароў — настолькі ён магутны і часам жахлівы. Упершыню пачуўшы яго, турысты кажуць: «Здаецца, што гэта не алень, а нейкі дыназаўр раве!» — смяюцца егеры. А калі будзе спрыяць удача, вам пашанцуе назіраць дуэль рагатых воінаў — бітву за прыхільнасць аленіхі або ласіхі.

— Гэтую моц трэба хоць бы раз у жыцці ўбачыць, пачуць, адчуць, — адзначае кіраўнік парка.

### • Патрымаць на далоні лясную птушку

Наступны напрамак экскурсійнай работы паглыбляе гасцей у навуку — арніталогію. І гэты маршрут ужо заваяваў любоў юных наведвальнікаў парку.

— Адзін з нашых аб'ектаў — Тураўскі луг, дзе адзначаецца найбольшая ў рэгіёне разнастайнасць пералётных птушак, — тлумачыць Юрый Аляксандравіч. — Для падтрымання біяразнастайнасці там пастаянна праводзіцца касьба, фрэзераванне кустоў, каб луг не зарастаў і птушкі працягвалі там гнездавацца. Экскурсія на гэты луг заўсёды праходзіць вельмі цікава.

А дзятве асабліва падабаецца станцыя кальцавання птушак. Арнітолаг загадзя адлоўлівае птушак і змяшчае ў спецыяльныя скрыначкі. Дзіця засоўвае ў скрыню ручку, бярэ, напрыклад, куліка, асцярожна адзявае яму на лапку кальцо. Аб гэтым робіцца запіс у адпаведных дакументах, пасля чаго малы сам выпускае птушку на волю. Экскурсія недарагая, усяго пяць рублёў, а станоўчыя эмоцыі запомняцца на ўсё жыццё.



Шматслойныя адклады ападкавых парод на беразе Прыпяці.

### • Злавіць 70-кілаграмовага сома

Калі вы пабываеце ва ўнікальным Музеі прыроды ў Ляскавічах, вам раскажуць, што ўсім жывым і нежывым на Прыпяцкім Палессі кіруе Яе Вялікасць Прыпяць, чароўная і зменлівая.

— За апошнія 200 гадоў яна не раз мяняла свой шлях праз лясы і лугі, сёння як мінімум на два кіламетры сышла ў бок ад старога рэчышча, — кажа **загадчыца музея Вольга ПАШУК.**

Воляю ўладаркі гэтых мясцін — «беларускай Амазонкі» — утвораны ўнікальныя ландшафты: пойма і надабалонныя тэрасы. І менавіта яна і найпрыгажэйшыя азёры вакол яе, як магнітам, прыцягваюць на поўдзень Гомельшчыны рыбакоў.



Экскурсавод Марыя ПАЛТАРАН дэманструе макет дна старыцы (старое рэчышча Прыпяці) у зале прыроды.



Музей прыроды — самы малады музей экалагічнай накіраванасці ў Беларусі.

— Што тут можна злавіць? Ды практычна ўсё, што водзіцца ў рэках і азёрах нашай краіны! — распавядае Юрый Апановіч. — У гэтыя выхадныя, напрыклад, быў здабыты сом на 38 кілаграмаў. Турысты злавілі яго, правялі з ім фотасесію і выпусцілі на волю (згодна з загадам аб рыбалцы, самы звыш 17 кілаграмаў выпускаюцца для захавання матачнага пагалоўя).

Дарэчы, самы вялікі сом, вылаўлены ў Прыпяці сёлета, важыў 72 кілаграмы. Зразумела, яго таксама выпусцілі. І гэта правільна як з этычнага пункту гледжання, так і з гастранамічнага: такая вялікая рыба — нясмачная. Але без улову не застаецца ніхто з турыстаў, кажуць егеры, бо самы менш за 17 кілаграмаў — законная здабыча рыбака.

— Вельмі шмат ловяць нашы госці судака, жэраха. Пастаянна трапляюцца асобіны па 7-9 кілаграмаў. У вадасховішчы Млынок маюцца карпы і сазаны, а таксама таўсталобікі на 40—45 кілаграмаў.

Таўсталобіка ловяць на паплаўковую вуду, а выцягнуць такую буйную рыбу з вады — сапраўдны паядынак чалавека і прыроды!

Нават калі вы не рыбак па натуры, вас не пакіне абыякавым катанне па Прыпяці на лодцы або на цеплаходзе. Рачны флот Нацыянальнага парка ўключае пяць вялікіх суднаў. Іх, дарэчы, часта арандуюць для правядзення вяселляў.

### • Захацець перачытаць «Дрыгву» і «Людзі на балоце»

Цікавіць экстрэмальны адпачынак? Патрэбны сапраўдны адрэналін? Запрашаем у самыя вялікія на Палессі і самыя некранутыя ў Еўропе бяздонныя верхавыя балоты, што знаходзяцца ў парку «Прыпяцкі» (іх узрост — каля 5-6 тысяч гадоў). Наогул, гэта запаведная тэрыторыя — балоты ўваходзяць у тыя 32 гектары парку, дзе забароненыя гаспадарчая дзейнасць і наведванне без суправаджэння вопытных егераў. Па-першае, таму што навукоўцам неабходныя месцы, дзе жыццёвыя цыклы праходзяць па-за антрапагенным уздзеяннем. Па-другое, без суправаджэння спецыялістаў вандраваць па балотах сапраўды небяспечна. З егерамі, вядома, сітуацыя з-пад кантролю не выйдзе. І ўсё ж маршрут па балотах і праўда цяжкі: дзе па калена, а дзе і па пояс у вадзе, па вузкай сцяжынцы сярод бяздоннай дрыгвы, праз буралом і ламачча. Затое ў канцы шляху (акрамя ўсяго таго дзіўнага і неверагоднага, што група сустрэне па дарозе) вас чакае таямнічае старажытнае гарадзішча. Адкрыта яно сёлета археолагам навуковага аддзела Нацыянальнага парка, і цяпер вядуцца перагаворы з Нацыянальнай акадэміяй навук аб правядзенні раскопак.

— Гарадзішча адносіцца да позняга бронзавага або ранняга жалезнага веку, гэта прамежак з V стагоддзя да нашай эры да III стагоддзя нашай эры, — распавядае **начальнік навуковага аддзела Нацыянальнага парка «Прыпяцкі» Андрэй БЯСПАЛЫ.** — Калі падчас раскопак будзе выяўлены культурны пласт, упэўнены, знаходка стане значнай для Палесся і ў цэлым для беларускай археалогіі.

Балотныя нячысцікі, якімі «насяліла» беларускія балоты багатая народная фантазія, як правіла, вартуюць «заклятыя скарбы». У анаэробным асяроддзі, без доступу паветра, усё, што трапіла ў балота, кансервуецца. Археалагічныя знаходкі, зробленыя ў балотах, — як правіла, у выдатным стане... Пакуль жа над старажытным паселішчам размешчаны барсуковы гарадок, які таксама складае інтарэс як турыстычны аб'ект.

— У цэлым, маршрут па балотах часам пераварочвае свядомасць людзей, — адзначылі ў запаведніку. — Дастаткова пачытаць водгукі турыстаў.

Невыпадкова этнографы кажуць, што менавіта багна некалі паўплывала на фарміраванне беларускай ментальнасці, бо балоты вучаць цярплівасці і спакою, стрыманасці і трываласці, надзейнасці і ўменню падставіць плячо ў цяжкую хвіліну, кемлівасці і мэтанакіраванасці, добразычлівасці, удумлівасці, талерантнасці.

### • Адчуць сябе Рабінзонам

— Для прыёму турыстаў у Нацыянальным парку «Прыпяцкі» створаны ўсе ўмовы. Гасцей мы размяшчаем у сучасным атэлі ў Ляскавічах, у гасцініцы ў Тураве. Ёсць катэджы ў вёсцы Дарашэвічы і ў Хлупінскай Будзе, — распавядае **начальнік турыстычнага комплексу «Ляскавічы» Ганна БАМБІЗА.** — Праўда, часта ўсё бывае забраніравана загадзя, асабліва на выхадныя. На 20 жніўня, калі адкрыецца фестываль «Покліч Палесся», нумароў ужо няма, — папярэджвае яна.

У будні атэлі парку «Прыпяцкі» звычайна загружаныя на 60—70 працэнтаў, дадае суразмоўніца. А ў выхадныя, асабліва летам, — стапрацэнтная загрузка.

— У суботу, нядзелю і святочныя дні экскурсійныя групы мы водзім пастаянна. Напрыклад, у нашым Сафары-парку ў будны дзень звычайна праводзім 3-4 экскурсіі. А ў выхадныя прагулкі ідуць кожную гадзіну, — адзначае **галоўны паляўніцтвазнавец Нацыянальнага парка «Прыпяцкі» Андрэй ЛЯЦКО.**

Зрэшты, атэлі і катэджы — не адзіная магчымасць засялення для гасцей: ёсць яшчэ кемпінгі, дзе можна адчуць сябе сапраўднымі «палескімі Рабінзонамі»:

— У нас ёсць дзве пляцоўкі, дзе турысты могуць разбіць палаткі, — кажа Ганна Васілеўна. — Сёлета мы зрабілі там рэканструкцыю альтанак, адрамантавалі кастровыя пляцоўкі. На стадыі распрацоўкі — праект турыстычнай інфраструктуры на возеры Чырвоным. Цяпер там арганізавана платнае аматарскае рыбалоўства, набыты лодкі для здачы ў арэнду. А да канца года з'явяцца стаянкі, кемперы, альтанкі, пантоны.

### • Пабываць на ўнікальным фестывалі «Покліч Палесся»

Першы фестываль «Покліч Палесся» прайшоў у адміністрацыйным цэнтры Нацыянальнага парка «Прыпяцкі» — аграгарадку Ляскавічы — у 2010 годзе. Тады ён сабраў больш за пяць з паловай тысяч гасцей, а ўдзельнікаў — з 11 рэгіёнаў Гомельшчыны і Брэстчыны. Фэст у 2012 годзе наведала ўжо больш за 10 тысяч гледачоў. У 2020-м (нават з улікам пандэміі) у Ляскавічы на фестываль сабралася 22 тысячы чалавек.

— Мяжу ў 22 тысячы гледачоў мы лёгка перасягнем, — перакананы генеральны дырэктар Нацыянальнага парка «Прыпяцкі». — Сёлета да нас паступіла мноства заявак. Будзе шмат удзельнікаў і тэматычных пляцовак, пацверджаны ўдзел многіх беларускіх і расійскіх творчых калектываў.

Маштабнае культурнае мерапрыемства знайшло падтрымку ў спонсараў — імі выступілі ААТ «Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод», ААТ «Белаграпрамбанк», ААТ «Гомельтранснафта Дружба», вытворчае аб'яднанне «Беларусьнафта», ААТ «Мозырсоль», РУП «Беларускія латарэі» і ААТ «Беларускі металургічны завод».



Егер Дзмітрый КАРЭЦКІ за рулём маторнай лодкі.




Наведвальнікі турыстычнага комплексу могуць атрымаць асалоду ад рачной вандроўкі на цеплаходах.



Сёння гасцініца «Над Прыпяццю» мае ўсё неабходнае для якаснага абслугоўвання турыстаў.



У пойме ракі Прыпяць вядзецца актыўная гаспадарчая дзейнасць у выглядзе нарыхтоўкі сена.

# ПАЛЕССЯ

КЛІЧ ПАЛЕССЯ
МІЖНАРОДНЫ ФЕСТЫВАЛЬ ЭТНАКУЛЬТУРНЫХ ТРАДЫЦЫЙ



Фота БелТА.




Фота Алены ДАЎЖАНОК.



Падчас прагулкі на цеплаходзе можна сустрэць шмат чапляў.

## «ПРЫПЯЦКІ» ЗБІРАЕ СЯБРОЎ

**Да VII Міжнароднага фестывалю этнакультурных традыцый «Покліч Палесся» застаецца менш за тыдзень — ён адбудзецца 20 жніўня.**

Амаль усё ўжо гатова да прыёму гасцей. Завяршаецца касметычны рамонт будынкаў і збудаванняў, падводзіцца дадатковая электрычнасць да фестывальных пляцовак. Фестывальныя падзеі ўжо распачаліся — у Ляскавічы прыехалі мастакі, якія працуюць з драўнінай. Яны створаць эксклюзіўныя творы, найлепшыя з якіх журы і гледачы назавуць на фестывалі.

Ляскавічы склікаюць сяброў не толькі з усёй Беларусі (найбольш актыўна на фэст традыцыйна прыязджаюць госці з раёнаў, якія адносяцца да Палескага рэгіёна), але і з-за межаў нашай краіны.

— Калі казаць аб Расійскай Федэрацыі, найбольшая колькасць турыстаў прыедзе з найбліжэйшых Бранскай і Курскай абласцей, а таксама з Масквы, — распавядае Юрый Аляксандравіч.

Па традыцыі, выставачная пляцоўка кожнага раёна-ўдзельніка фестывалю — падворак — прадставіць сваю ўласную «разыначку»: тое, што адрознівае дадзеную мясцовасць ад іншых палескіх рэгіёнаў. Унікальны абрад, старадаўнія танцы, мясцовая кухня або рамёствы...

— Гэта дазволіць наведвальнікам свята зразумець самабытнасць Палесся, — тлумачыць **намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце Нацыянальнага парка «Прыпяцкі» Святлана ШВЕЦ.**

Толькі на «Поклічы Палесся» можна ўзяць удзел у майстар-класе па старадаўніх рамёствах, пачуць часам незаслужана забытыя аўтэнтычныя песні, адчуць непаўторную, вельмі асабістую і шчырую, надзвычай беларускую атмасферу фестывалю. Як і ў мінулыя гады, на фэсце выберуць «Палескую прыгажуню», адбудзецца спаборніцтва рыбаловаў «Палеская рыбалка». Але фестывальная праграма прадугледжвае і сюрпрызы...

— Навінкой стане рыцарскі бугурт-фэст (ён упершыню будзе праходзіць на нашым фестывалі), — распавядае Юрый Апановіч. — Гасцей захопіць воднае флайборд-шоу. А ў падтрымку Года гістарычнай памяці мы вырашылі абсталяваць фестывальную зону «Партызанскі побыт»: на беразе Прыпяці з'явіцца партызанскі лагер часоў Вялікай Айчыннай вайны.

«Мы не змаглі застацца ў баку ад гэтай тэмы», падкрэслівае кіраўнік. Тым больш што партызанскі рух — яркая старонка самабытнай гісторыі Палесся, якая шмат у чым паўплывала на фарміраванне ментальнасці сучаснага пакалення палешукоў.



У музеі пад адкрытым небам «Сафары-парк» можна сустрэць насельнікаў нацыянальнага парку.



Кафэ «Хата палешука» — ідэальнае месца для аматараў беларускай кухні.



Афіцыянтка Валерыя КУПРЭЙ удакладняе ў старшага кухара Андрэя НІСТРАТАВА асаблівасці меню кафэ «Хата палешука».



Намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце Святлана ШВЕЦ.

## КОЛЬКІ КАШТУЕ АЛЕНЬ?

Найважнейшая сфера дзейнасці Нацыянальнага парка «Прыпяцкі» — даследчая. Навуковы аддзел запаведніка працуе па розных напрамках. Гэта і археалогія, і, зразумела, біялогія, арніталогія, іхтыялогія, і геаінфармацыйныя сістэмы. Навукоўцы адсочваюць штогадовыя прыродныя з'явы, выяўляючы тэндэнцыі і дынаміку змяненняў, і складаюць своеасаблівы летапіс прыроды. А яшчэ — распрацоўваюць маршруты экалагічнага турызму, якія дазваляюць убачыць рэдкія і знікаючыя віды раслін і жывёл, насякомых і птушак.

— У нас велізарная разнастайнасць такіх відаў, — кажа **начальнік навуковага аддзела НП «Прыпяцкі» Андрэй БЯСПАЛЫ.** — Напрыклад, сёлета мы выявілі тры папуляцыі ўнікальнай расліны «венерын чаравічак». Таксама намі знойдзена найбуйнейшая ў краіне калонія залацістай шчуркі.



Начальнік навуковага аддзела НП «Прыпяцкі» Андрэй БЯСПАЛЫ.

Больш за тое, распавядае навуковец, адну шчурку атрымалася акальцаваць (чаго не здаралася ўжо 15 гадоў), і гэта таксама перамога для навукі.

А наогул, кажучы аб чырванакніжніках, абывацель мае на ўвазе ў першую чаргу буйных жывёл. Дык вось, у Нацыянальным парку ёсць дзве мікрапапуляцыі зуброў — усяго 129 асобін. І сёлета тут нарадзілася ўжо тры зубраняці, чаму навукоўцы неверагодна радыя.

Яшчэ адзін найважнейшы кірунак работы калектыву НП «Прыпяцкі» — і для нашай краіны, і для Еўропы ў цэлым — захаванне біяразнастайнасці.

— У «Прыпяцкім» ёсць і драпежнікі ў аптымальнай колькасці для нашага рэгіёна, — распавядае **галоўны паляўніцтвазнавец Андрэй ЛЯЦКО.** — Шмат рысяў, што вельмі добра: гэты спрадвечна беларускі драпежнік павінен быць на дадзенай тэрыторыі. Драпежнікі падтрымліваюць натуральны адбор, дапамагаюць рэгуляваць колькасць капытных жывёлін, таму што, напрыклад, высакароднага аленя ў нас, можна сказаць, зашмат.

Аленяў у парку сапраўды шмат: 25 гадоў калектыў займаецца аднаўленнем іх папуляцыі.

— Мы ўдзельнічаем у праграме «Беларускі лес» і некалькі гадоў запар аказваем дапамогу лясгасам Беларусі, якія зацікаўленыя ў рассяленні аленя, — тлумачыць генеральны дырэктар. — Летась рэалізавалі 130 галоў аленя (у Веткаўскі, Жлобінскі і іншыя лясгасы).

Сёлета парк плануе адправіць у лясгасы Беларусі ад 150 да 200 лясных прыгажуноў, бо «Прыпяцкі» можа пахваліцца найбуйнейшай у краіне папуляцыяй аленяў — каля паўтары тысячы галоў.

Як правіла, распавялі ў «Прыпяцкім», лясгасы купляюць па 30-40 асобін — 3-5 самцоў, астатнія — самкі і сяголеткі. Каштуе алень, дарэчы, ад 2,5 да 4 тысяч, у залежнасці ад полу і ўзросту.

— Рэалізоўваюць аленяў восенню, пасля гону: мы стараемся, каб самкі былі аплодненыя. У лясгасах алені застаюцца на зіму ў каранцінnай вальеры да моманту нараджэння цялят, і толькі пасля таго статак выпускаюць у лес. Так у іх выпрацоўваецца адчуванне дому, і яны застаюцца жыць недалёка ад вальеры launch

— Ці можна сказаць, што сёння нават дзікая прырода прыручаная чалавекам? — пытаюся ў Юрыя Аляксандравіча.

— У некаторай ступені так і ёсць. Жывёлы, як і людзі, лёгка прывыкаюць да добрага. Калі лясная гаспадарка на высокім узроўні вядзе біятэхнічныя мерапрыемствы — а гэта ў першую чаргу падкормка, стварэнне саланцоў і г. д., жывёлы гэта разумеюць. І, асабліва ў зімовы перыяд, канцэнтруюцца на тэрыторыях, дзе выжыць ім дапамагае чалавек. Напрыклад, чырванакніжнік-арлан (самы вялікі арол Беларусі з размахам крылаў 2-2,5 м) летам гняздуецца ў пойме, а ў пачатку зімы перасяляецца бліжэй да кармавых пляцовак. Прыкладам можа служыць і ў цэлым наш Сафары-парк, дзе жыве каля 170 галоў аленя, каля 60 ланяў, больш за 30 казуль, вялікая папуляцыя дзікоў. Дарэчы, сёлета ў нас папаўненне — 24 парасяці, — усміхаецца кіраўнік.

Ён распавядае, што сярод парсючкоў, што з'явіліся на свет гэтай вясной, ёсць унікальныя асобіны — белыя ў яблыкі. Гэта — спадчына тых часоў, калі на Палессі ў кожным двары трымалі свіней, і свінні тут былі на вольным выпасе. Здаралася, сыходзілі ў лес, а вяртаючыся да гаспадароў, «прыносілі ў падоле» лясных парсючкоў — рыжанькіх з палоскай на спінцы. Бывала і наадварот: дзікай свінцы прыходзіўся даспадобы свойскі кныр. З тых часоў і нараджаецца часам у статку дзікоў некалькі ружовенькіх парасят. А вось бялюткая, шляхетнага выгляду казуля-альбінос, якую таксама можна сустрэць у Сафары-парку, — рэдкі капрыз прыроды, чалавек тут ні пры чым.

— На тэрыторыях, дзе размешчаныя кармавыя пляцоўкі (у нас кармушкі ўстаноўленыя на розных узроўнях, каб усе лясныя жыхары маглі падсілкавацца), дзікія жывёлы становяцца менш палахлівымі, больш прывыкаюць да людзей, — вяртаецца да пытання кіраўнік. — І тут галоўнае — не перабраць з клопатам. У зімовы перыяд мы даем жывёлам каля 30-40 % іх рацыёну. Калі гэтая доля будзе большай, звяры развучацца здабываць ежу і ператварацца ў «свойскіх гадаванцаў».



У гэтых хатках размешчаны экспазіцыі вырабаў народных рамёстваў.



У Сафары-парку ёсць месца казцы, напрыклад, там можна сустрэць Кашчэя.

## ЧАЛАВЕК ЛЕСУ

Калі спытаць у **генеральнага дырэктара Нацыянальнага парка «Прыпяцкі» Юрыя АПАНОВІЧА,** якія тры месцы абавязкова наведаць, упершыню трапіўшы ў Ляскавічы, першым ён назаве гісторыка-этнакультурны комплекс «Музей пад адкрытым небам».

— Другі аб'ект — Музей прыроды, а трэці — непаўторная экскурсія ў Сафары-парк. Ёсць і чацвёрты, на мой погляд, абавязковы для кожнага турыста маршрут — водная прагулка па рацэ Прыпяць.

Палеская ментальнасць, унікальны характар палешукоў — тое, што ляжыць у аснове канцэпцыі Нацыянальнага парка «Прыпяцкі». Так яго шмат гадоў ствараў **першы кіраўнік Сцяпан БАМБІЗА.** І ў гэтым жа кірунку развівае парк яго цяперашні генеральны дырэктар, бо палескія лясы — родныя мясціны Юрыя Аляксандравіча.

— Я тутэйшы, нарадзіўся ў пасёлку Капцэвічы Петрыкаўскага раёна, — распавядае ён. — І мая сувязь з прыродай вельмі цесная, як у большасці мясцовых ураджэнцаў. З ранняга дзяцінства лес быў для мяне добрым сябрам. У няпростыя 1990-я з дзесяцігадовага ўзросту я хадзіў у грыбы і ягады. Лес на Палессі заўсёды быў карміцелем, і асабліва — у цяжкія часы. І выбар прафесіі не выклікаў цяжкасцяў — у 2001 годзе я паступіў у Полацкі дзяржаўны лясны тэхнікум, які скончыў па спецыяльнасці «Майстар лесу, тэхнік лясной гаспадаркі».

Гэта быў унікальны тэхнікум, на той момант адзіны ў краіне, які рыхтаваў «майстроў лесу», успамінае кіраўнік.

— Менавіта гэтая навучальная ўстанова дала мне выдатную базу, заклала асновы ўсіх маіх прафесіянальных ведаў. Летась тэхнікум адзначыў стагадовы юбілей, і я ганаруся, што з'яўляюся яго выпускніком.

Пасля былі служба ў войску, гады вучобы (Бранская інжынерна-тэхналагічная акадэмія, Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце) і работы (у тым ліку — на пасадзе галоўнага ляснічага лесапаляўнічай гаспадаркі «Ляскавічы» і дырэктара Петрыкаўскага лясгаса). І ў 2021 годзе Юрый Апановіч заняў адказную пасаду генеральнага дырэктара Нацыянальнага парка «Прыпяцкі», адной з найбуйнейшых прыродаахоўных структур у краіне.

Сёння пад кіраўніцтвам Юрыя Аляксандравіча — больш як тысяча супрацоўнікаў: сярэдняспісачная колькасць працоўнага калектыву — 1311 чалавек, з іх 236 — ва ўзросце да 31 года.

— На жаль, у лясной галіне апошнія дзесяць гадоў адчуваецца дэфіцыт маладых кадраў, — падкрэслівае кіраўнік.

Галіна лясной гаспадаркі — не толькі вельмі цікавая, але і вельмі цяжкая, адзначае ён. І, на жаль, далёка не кожны, хто адвучыўся па профільнай спецыяльнасці, аказваецца гатовы прысвяціць жыццё лесу. Каб у калектыў прыходзілі найлепшыя маладыя кадры, у Нацыянальным парку «Прыпяцкі» вядзецца мэтанакіраванае супрацоўніцтва з навучальнымі ўстановамі. А інфраструктура для замацавання маладых спецыялістаў у Ляскавічах створана. Ім выдзяляецца інтэрнат, два гады таму для маладых спецыялістаў быў пабудаваны шматкватэрны дом, распавядае Юрый Аляксандравіч.

— І ў цэлым, Ляскавічы — гэта, можна сказаць, менавіта той аграгарадок, які першапачаткова задумваўся кіраўніцтвам краіны. Тут ёсць агульнаадукацыйная школа і дзіцячы садок, аддзяленне банка і ФАП, цырульня і крамы, рэстаран і кавярня. Тут створаны ўмовы і для таго, каб прафесійна расці, і для таго, каб будаваць шчаслівую сям'ю. Так што мы запрашаем усіх — і тых, хто прыедзе адпачываць, і тых, хто прыедзе працаваць!

Матэрыялы падрыхтавалі Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Лізаветы ГОЛАД.

УНП 400050258.

# «Я Ў МАМЫ СОНЕЙКА»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Прыехала сюды 22 чэрвеня. Жыву на праспекце Рэчыцкім, — выразна гаворыць на рускай мове Дарына і называе свой новы адрас у Гомелі.

Дзяўчынцы — восем. Кажа, разам з трохгадовым братам Вовам, мамай Аняй і татам Жэнем прыехалі ў Гомель з Марыупаля. Уражвае, наколькі дзіця дакладна, па датах, жахліва спакойна расказвае аб тым, што яе сям'я перажыла ў родным горадзе.

— Жыла на Багдана Хмяльніцкага, — называе Дарына іншы адрас: вуліца тая ж, што ёсць тут, у Гомелі. Але. Асякаюся пасля яе фразы:

— Там дома ўжо няма, яго знеслі, але мне сказалі, што новы будуюць, — расказвае малая пра свой дом, які моцна пацярпеў, у Марыупалі.

На маё пытанне «Як табе ў Гомелі?» адказвае таксама вельмі спакойна, што яшчэ больш сціскае сэрца.

— Мне тут падабацца, таму што ёсць святло!

Кажа, што, калі вайна пачалася, святла, газу, ацяплення, вады ў іх не было.

— Сядзелі без анічога, а ўвечары запальвалі свечкі, але эканомілі. Мама і тата перасталі хадзіць на работу, а калі вайны не было, яны працавалі, — дадае дзяўчынка. — Пасля хадзілі «па гуманітарку» ад мэра. Потым паехалі ў Расію. Мама прайшла фільтрацыю, — зусім сур'ёзна прамаўляе дзіця дарослае слова. — Потым мы паехалі далей. На вакзале сядзелі вельмі доўга, пакуль атрымалі білеты.

У Гомель, як растлумачылі ўжо бацькі Дарыны — Яўген і Ганна, — прыехалі да далёкіх сваякоў. Цяпер здымаюць кватэру, уладкоўваюцца.

— Самі родам з Марыупаля. З'ехалі ўжо пасля таго, як гэта ўсё там у нас скончылася. Да гэтага выехаць нельга было. На вуліцу таксама не маглі выходзіць, таму што кожны дзень, кожную мінуту, кожную секунду нешта прылятала. З намі ў кватэры былі бацькі жонкі. Да іх у шматпавярховік снарад прыляцеў на апошні паверх, разбурыў дах. Цяпер там усё аднаўляюць. А тады ўсе разам сядзелі спачатку ў адным пакоі ў нашай кватэры, потым перабраліся ў калідор, а потым ужо спусціліся ў склеп. Туды спусцілі самыя неабходныя рэчы, думалі, калі нешта прыляціць у кватэру, хоць уцалее ў падвале. Аказалася ўсё па-іншаму, кватэра ўцалела, а склеп цалкам згарэў, — распавядае Яўген.

Дапаўняе: згарэлі тэлефоны, але самае горкае для іх — усе сямейныя фатаграфіі, усе фота малых Дарыны і Вовы.

— Дзеці адышлі і адаптаваліся, гэта відаць, — адказвае на маё пытанне Яўген. — Калі былі ў Марыупалі, ужо быццам усё скончылася, але чуваць было недзе далёкія выбухі, дык маленькі асабліва крычаў, прасіў усіх хавацца хутчэй.

Цяпер галоўнае пытанне для сям'і марыупальцаў — уладкаваць дзяцей тут, у Гомелі. У школу — старэйшую,



а маленькага — у дзіцячы сад. Самім жа — працаўладкавацца.

— Калі толькі ўсё ў нас там пачалося, работа спынілася. Засталіся без грошай. У нас былі зберажэнні на картцы, але зняць з яе мы нічога не можам, таму што Украіна паставіла забарону на нашы карткі і ўсё, — разводзіць рукамі малады тата.

Галава сям'і і яго жонка Ганна па прафесіі — чыгуначнікі. Ён быў дзяжурным па сартавальнай горцы, яна — дзяжурнай па станцыі. У Гомелі Яўген ужо паспеў знайсці работу — уладкаваўся ў прыватную фермерскую гаспадарку, займаецца сартаваннем і пакаваннем садавіны і ягад. Работа часовая. Кажа, ужо звярнуўся ў Гомельскае аддзяленне Беларускай чыгункі: спадзяецца, што зможа ўладкавацца па спецыяльнасці. Як толькі вызначыцца пытанне са школай і садком для дзяцей, спадзяецца таксама, што добра працаўладкуецца і яго жонка Ганна.

Цікаўлюся ў бацькоў, ці ёсць хваляванні, як іх дачка пасля двух гадоў навучання ва ўкраінскай школе будзе займацца ў Беларусі?

— Гаворым мы па-руску, але ў школе — так, усё было толькі па-ўкраінску. Па матэматыцы вельмі складана было на ўкраінскай. Думаем, у гэтым плане давядзецца перабудоўвацца, — адказваюць тата і мама дзяўчынкі.

Бацькі кажуць: для іх каласальная дапамога, што цяпер перад школай і садком можна прывесці дзяцей пазаймацца ў спецыяльна абсталяваны дзіцячы пакой. На Гомельшчыне, акрамя абласнога цэнтра, такія ж адкрыты ў Мазыры, Калінкавічах і Рэчыцы. Для дзяцей з Украіны тут рыхтуюць разнастайныя інтэрактыўныя навучальныя заняткі, а яшчэ даюць ім магчымасць стасункаў з беларускімі аднагодкамі. Аказваецца ўвогуле любая пасільная дапамога і падтрымка.

— Такая праца з дзецьмі з сем'яў, якія знайшлі прыстанішча ў Беларусі, дапамагае ім хутчэй сацыялізавацца, прывыкнуць да нашай краіны і культуры, — упэўненая **старшыня Гомельскай раённай арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Кацярына ТРЭГУБАВА.** — На практыцы, калі займаешся з дзецьмі і яны «адчуваюць цябе», як той казаў, то не трэба распытваць, яны самі захочуць прагаварыць, падзяліцца тым, што перажылі. Украінскія сем'і прыходзяць да нас кожны дзень. Працуем з усімі, хто пражывае на тэрыторыі Гомеля і Гомельскага раёна.

У гомельскім дзіцячым пакоі навучальныя заняткі з дзецьмі з Украіны праводзяць валанцёры Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа — да двух дзясяткаў педагогаў з абласнога цэнтра.

— Выконваюцца тры галоўныя віды работы з дзецьмі. Гэта адукацыйная работа — не толькі падрыхтоўка да школы, але і пазнавальныя культурныя мерапрыемствы. Абавязкова — творчы кампанент, можна аб'яднацца ў клубы па інтарэсах. Трэці від работы — аказанне псіхалагічнай падтрымкі. Штотыдзень псіхолаг гатовы працаваць. Гэта вельмі важна для бацькоў, якія просяць дапамагчы пераадолець іх дзецям жахі, якія яны перажылі, — паясніў **начальнік арганізацыйна-кадравага аддзела Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Арцём КАРПЕНКА.** — Важна і тое, што калі бацькі прыйшлі афармляць якую-небудзь дапамогу, дзеці спакойна ў дзіцячым пакоі займаюцца, гуляюць, адпачываюць. Пры гэтым, калі ў бацькоў ёсць неабходнасць пакінуць дзіця пад наглядам у дзіцячым пакоі, пакуль дарослыя, напрыклад, працаўладкоўваюцца, займаюцца афармленнем дакументаў, такая магчымасць таксама ёсць.

Работа дзіцячых пакояў — форма падтрымкі, папулярнасць якой расце з кожным днём, адзначыў начальнік арганізацыйна-кадравага аддзела. «Мы сёння і ў горадзе, і ў вобласці назіраем прыток грамадзян з Украіны. Ім важна інтэгравацца, сацыялізавацца, таму такая форма аказання дапамогі сем'ям будзе, безумоўна, запатрабаваная», — падкрэсліў Арцём Карпенка.

Гомельская абласная арганізацыя Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа таксама працягвае актыўную дапамогу вымушаным мігрантам прадуктамі харчавання, адзеннем, сродкамі гігіены і медыцынскага догляду. Звярнуцца можна і па інфармацыйную дапамогу.

Між тым сёння Гомельскай абласной арганізацыяй БТЧК у Гомелі запушчаны новы сэрвіс падтрымкі — «Аранжавы пакой бяспекі». Яго сутнасць — аказанне псіхалагічнай, медыцынскай, прававой дапамогі жанчынам з Украіны, што сталі вымушанымі бежанцамі. Звярнуцца па дапамогу ў Гомелі могуць грамадзянкі, якія прыехалі з суседняй краіны, незалежна ад новага месца жыхарства на Гомельшчыне.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота Ірыны АСТАШКЕВІЧ.**

### У ТЭМУ

У новым навучальным годзе ў дзіцячыя сады і школы Гомельшчыны пойдуць 111 дзяцей з Украіны. Непаўналетнія, якія прыехалі са сваімі бацькамі з суседняй краіны і звярнуліся па дапамогу ў атрыманні дашкольнай і школьнай адукацыі, будуць карыстацца такімі ж сацыяльнымі льготамі, што і беларускія дзеці. Прадугледжана 30-працэнтная льгота на аплату харчавання ў дзіцячых садах, калі дашкольную ўстанову наведваюць двое дзяцей. У пачатковай школе гаворка ідзе пра бясплатнае харчаванне, а калі ў сям'і двое дзяцей-школьнікаў, то напалову зніжаецца плата за падручнікі. Згодна з беларускім заканадаўствам, дзеці ў школе павінны будуць асвоіць адну з дзяржаўных моў — рускую ці беларускую. Мяркуецца, што гэта будзе тая мова, на якой вядзецца навучанне ва ўстанове. Перад пачаткам новага навучальнага года на Гомельшчыне ўкраінскія сем'і матэрыяльна падтрымалі грамадскія і дабрачынныя арганізацыі, калектывы, у якіх працуюць мігранты. Частка сродкаў, сабраных у рэгіёне ў тым ліку ў рамках акцыі «Збяром дзяцей у школу!», таксама будзе накіравана на падрыхтоўку ўкраінскіх дзяцей да новага навучальнага года.

Вышэйшая школа

# Інфармацыйная бяспека як неабходнасць

**З 15 жніўня факультэт інфакамунікацый БДУІР стаў факультэтам інфармацыйнай бяспекі. Што стаіць за новай назвай і якія змены чакаюць студэнтаў, расказаў дэкан факультэта Сяргей ДРОБАТ:**

— Перайменаванне, я нават сказаў бы, пераўтварэнне нашага факультэта звязана са зменамі, якія адбываюцца ў Беларусі ды і ва ўсім свеце, і значным уплывам інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій на ўсе сферы дзейнасці чалавека. Пераход на электронны дакументазварот, аказанне электронных паслуг насельніцтву, лічбавізацыя эканомікі немагчымыя без развіцця метадаў і сродкаў гарантавання бяспекі інфармацыі. Зыходзячы з існуючых патрэб рэальнага сектара эканомікі ў спецыялістах па інфармацыйнай бяспецы, трэба пашыраць наменклатуру прафілізацый па гэтым напрамку. Профільны факультэт у БДУІР забяспечыць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў, эфектыўнае ўзаемадзеянне з заказчыкамі кадраў, і пры неабходнасці мы зможам дастаткова хутка павялічыць колькасць спецыялістаў, якія выпускаюцца, для рэалізацыі асноўных палажэнняў, замацаваных у Канцэпцыі інфармацыйнай бяспекі Рэспублікі Беларусь і Законе Рэспублікі Беларусь «Аб абароне персанальных даных».

Факультэт інфакамунікацый (з 15 жніўня — факультэт інфармацыйнай бяспекі) мае вялікі вопыт падрыхтоўкі спецыялістаў у галінах тэхнічнай і крыптаграфічнай абароны інфармацыі і гарантавання бяспекі інфакамунікацыйных тэхналогій. Але факультэт не перастае развівацца: змены закранулі не толькі назву, але і змест адукацыйных праграм.

«Для пашырэння кампетэнцый, якія набывае спецыяліст у галіне аховы інфармацыі і інфармацыйнай бяспекі, былі перапрацаваны навучальныя планы, уведзены новыя дысцыпліны: «Сацыяльна-псіхалагічныя аспекты інфармацыйнай бяспекі», «Ліцэнзаванне дзейнасці ў сферы абароны інфармацыі», «Абарона інфармацыйных сетак», «Сеткі блокчэйн», «Сеткавае і сістэмнае адміністраванне», «Сеткавая бяспека», «Бяспека сетак інфакамунікацыі», «Бяспека інфакамунікацыйных сэрвісаў» і іншыя. На кафедры абароны інфармацыі плануецца падрыхтаваць шэраг дысцыплін, якія паглыбляюць падрыхтоўку ў галіне кібербяспекі», — расказаў дэкан факультэта.

З 2023 года на факультэце мяняецца пералік спецыяльнасцяў агульнай вышэйшай адукацыі, па якіх будзе ажыццяўляцца падрыхтоўка. Гэта будуць такія ж спецыяльнасці, як і для паглыбленай вышэйшай адукацыі — магістратуры. Кафедра інфакамунікацыйных тэхналогій будзе рыхтаваць кадры па спецыяльнасці «Сістэмы і сеткі інфакамунікацый», а кафедра абароны інфармацыі — па спецыяльнасці «Інфармацыйная бяспека». Выпускнікі факультэта будуць дасканала ведаць метады, якія забяспечваюць інфармацыйную бяспеку пры інфарматызацыі і лічбавізацыі сучаснага грамадства, і ўмець прымяняць іх для эфектыўнай абароны даных.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**



Суседзі

# ЦУГЦВАНГ ПА-ВАРШАЎСКУ

## Куды рушаць польскія ўлады?

**САМЫЯ важныя выклікі, з якімі палякам давядзецца сутыкнуцца ўжо адразу пасля летніх канікулаў, — гэта энергетычны крызіс, высокія працэнтныя стаўкі і будучы эканамічны спад. Такое меркаванне выказаў у інтэрв'ю Business Insider вядомы ў Варшаве эканаміст, прэзідэнт Польскага фонду развіцця Павел Борыс. Крызіс такога маштабу будзе суправаджацца бурнымі сацыяльнымі разрадамі, заўважыла Mysl Polska. «Пашыраецца хваля незадаволенасці. Гнеў павялічваецца. Усё смялей людзі пратэстуюць, усё больш рэзка выказваюцца. Мы штодня назіраем змену настрояў і іх радыкалізацыю», — адзначыла выданне. Гэта рэакцыя простых палякаў на дзеянні афіцыйнай Варшавы, якая захапілася палітычнымі гульнямі ва ўрон уласнаму народу. Куды ж рушаць польскія ўлады?**

### ВАР'ЯЦТВА І ЗАНЯПАД

Нацыянал-кансерватыўны ўрад Польшчы значна ўзмацніў жорсткасць сваёй рыторыкі ў дачыненні да Бруселя ў пытанні вяршэнства права, пагражаючы накіраваць «усе свае гарматы» на Еўрапейскую камісію і, калі спатрэбіцца, стварыць кааліцыю для звяржэння яе старшыні Урсулы фон дэр Ляен. Аднак такая агрэсіўная палітыка можа ў канчатковым выніку прывесці да выключэння гэтай краіны з ЕС, адзначыла брытанскае выданне The Guardian.

Генеральны сакратар кіруючай у Польшчы партыі «Права і справядлівасць» (ПіС) Кшыштаф Сабалеўскі нядаўна заявіў, што, калі кіраўніцтва ЕС паспрабуе прыціснуць Варшаву да сцяны, у польскіх улад не будзе іншага выбару, акрамя як «выцягнуць усю зброю з арсенала» і адказаць па прынцыпе «вока за вока».

Сабалеўскі таксама заявіў у інтэрв'ю польскаму дзяржаўнаму радыё, што, калі Еўракамісія не выдзеліць Польшчы 35 мільярдаў еўра на дапамогу ў барацьбе з пандэміяй, Варшава падасць у суд на Брусель, накладзе вета на ініцыятывы ЕС і створыць альянс для таго, каб зрушыць Урсулу фон дэр Ляен з яе пасады кіраўніка ЕК і адправіць у адстаўку яе калегію камісараў.

Пагрозы Сабалеўскага пасыпаліся пасля таго, як Яраслаў Качыньскі, які ў чэрвені сышоў з пасады віцэ-прэм'ера Польшчы, але застаецца старшынёй ПіС і фактычным лідарам краіны, заявіў у інтэрв'ю часопісу Sieci, што ў Варшавы няма прычын выконваць свае абавязальніцтвы перад ЕС. Варшава на працягу апошніх месяцаў вядзе жорсткую спрэчку з Еўракамісіяй наконт выдзялення сродкаў на аднаўленне краіны пасля пандэміі. Між тым Брусель патрабуе, каб Польшча выканала шэраг крокаў у галіне вяршэнства закона, перш чым можна будзе разблакаваць для яе гранты і крэдыты.

Урад Польшчы, судовыя рэформы якога, на думку ЕК, пазбавілі незалежнасці судовую сістэму краіны, у мінулым месяцы пайшоў на саступкі Бруселю і ліквідаваў дысцыплінарную палату для суддзяў. Аднак на фоне папярэджанняў аб тым, што замест гэтай палаты ў Польшчы будзе створаны новы, таксама палітычна кантралюемы орган, Урсула фон дэр Ляен абвясціла, што Варшава яшчэ не дасягнула неабходнага прагрэсу, каб разблакаваць для яе першы грашовы транш.

У адказ Качыньскі заявіў, што ўрад Польшчы не будзе рабіць далейшых крокаў для выканання патрабаванняў Еўракамісіі. Польскі палітык абвінаваціў Брусель у жаданні «разбурыць законнасць у Польшчы» і прымусіць яе «цалкам падпарадкавацца Германіі». Ён таксама абвінаваціў польскую апазіцыю ў змове з Бруселем і іншымі краінамі.

«Чым больш Качыньскі палохае ЕС, тым больш ён здаецца недарэчным. Ніхто не ўспрыме ўсур'ёз чалавека, які замест вялікіх сродкаў аддае перавагу даць палякам галечу, беззаконне, знішчэнне незалежнасці судовай улады і #Polexit. Сімвал вар'яцтва і заняпаду», — напісаў у «Твітэры» Гжэгаж Схетына з апазіцыйнай партыі «Грамадзянская платформа».

### РОСТ ЦЭН — 420 ПРАЦЭНТАЎ

Тым часам жыхары Польшчы ўсё больш апасаюцца, што асенне-зімовы перыяд сёлета будзе вельмі дарагім з пункту гледжання затрат на ацяпленне і гарачую ваду. Ёсць шмат прыкмет таго, што гэтыя асцярогі не перабольшаныя, паведамляе выданне Gazeta.pl. Ужо з усіх рэгіёнаў краіны, у тым ліку з Варшавы і Кракава, паступаюць паведамленні аб павышэнні тарыфаў на ацяпленне, якое месцамі дасягае 100 працэнтаў.

Гэта звязана з тым, што ЦЭЦ, як і спажыўцы, зараз вымушаны купляць вугаль па значна больш высокіх цэнах, чым раней. Паводле апошняй справаздачы польскага Агенцтва па прамысловым развіцці, кошт сыравіны ў ліпені ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года павялічыўся больш чым на 250 працэнтаў. Прычына — рост цэн на вугаль на рынку ЕС, выкліканы эмбарга на пастаўкі газу з Расіі, а таксама павышэнне кошту квот на выкіды $CO_2$.

Драматычнае становішча прадпрыемстваў, якія адказваюць за ацяпленне, пацвярджае прэзідэнт



Польскай гандлёвай палаты цэнтралізаванага цеплазабеспячэння Яцэк Шымчак. На яго думку, без умяшання дзяржавы цеплацэнтралі не справяцца. «Сітуацыя вельмі сур'ёзная. Многія прадпрыемствы, асабліва малыя, не маюць магчымасці браць крэдыты і купляць паліва на пазыковыя сродкі з-за цяжкага фінансавага становішча. А за імпартны вугаль трэба плаціць загадзя або адразу ж пасля дастаўкі», — паведаміў Шымчак.

### ПАДДОСЛЕДНЫ ТРУС

У мінулым годзе Польшча імпартавала больш за 8 мільёнаў тон расійскага вугалю. Аднак, паводле даных выдання Mysl Polska, сёлета дэфіцыт ужо складае 11 млн тон. Да такога становішча прывяла не толькі адмова ад паставак з Расіі, але і скарачэнне ўласнай вытворчасці. Парадокс у тым, што Варшава не можа нават паспрабаваць вырашыць праблему дэфіцыту за кошт павелічэння здабычы вугалю на ўласнай тэрыторыі. Брусель вымусіў Польшчу пайсці на паступовую ліквідацыю вугальнай здабычы, шантажыруючы выдзяленнем датацый для краіны. У выніку штогод здабыча вугалю ва ўсходнееўрапейскай краіне скарачаецца.

Польшча ў тупіку: нарасціць уласную здабычу немагчыма, імпартаваць таксама амаль нерэальна — у многіх краін аб'ёмы ўжо закантрактаваны, а цэны «кусаюцца». У такіх умовах краіна пачне ацяпляльны сезон, калі яго ўвогуле можна будзе так назваць, цалкам непадрыхтаванай. «Цяпер польскаму кіраўніцтву трэба будзе вырашаць праблемы не палітычныя, а эканамічныя. Гісторыя з закупкамі мільёнаў тон вугалю, якія не адбыліся, якія павінны былі сфарміраваць стратэгічны запас, можа пахаваць усю ўладу ўрада «Права і справядлівасці». Зараз Польшчы неабходна знайсці вугаль, але, мяркуючы па дзеяннях урада Маравецкага, ёсць дзве праблемы. Першая — улады не могуць вызначыцца з рашэннямі. Спачатку ішла размова аб датацыях вугальным кампаніям, цяпер прасоўваецца ідэя аб аднаразовай дапамозе ў памеры тры тысячы злотых хатнім гаспадаркам, якія працуюць на вугалі. Ніхто не дасць гарантыі, што ў далейшым не будзе прынятае трэцяе, чацвёртае і пятае такое рашэнне», — распавёў Baltnews палітолаг, эксперт па Польшчы Станіслаў Страмідлоўскі.

«Другая праблема — апаратны крызіс. Ва ўрадзе спрабуюць перакласці адзін на аднаго адказнасць за зрыў закупак вугалю. Гэты крызіс будзе ўплываць на прыняцце рашэнняў і кіраванне крызісам. Калі гэта не будзе вырашана, то тады наступіць ужо палітычны крызіс з пачаткам ацяпляльнага сезона альбо нават раней. Некаторыя польскія эксперты прагназуюць, што ўжо ў канцы жніўня ці пачатку верасня Польшча можа сутыкнуцца з масавымі пратэстамі. І гэты крызіс ПіС можа ўжо не перажыць», — заўважыў эксперт.

Адзіны варыянт для іх — гэта ў тэрміновым парадку шукаць вугаль і купляць яго па любой цане. Гэта абыдзецца вельмі дорага бюджэту краіны, чым скарыстаюцца палітычныя апаненты ПіС. Неяк дапамагаць Польшчы ў гэтай складанай сітуацыі Еўрасаюз не спяшаецца. Дзяліцца вуглём краіны ЕС не будуць, і нават абмежаванні на здабычу Брусель не здымае (штраф у памеры 500 тысяч еўра ў дзень за дзейнасць на шахце «Тураў» дагэтуль актуальны). Ствараецца адчуванне, што Еўропа проста назірае за развіццём гэтага крызісу, а Польшча выступае ў ролі паддоследнага труса.

### НА МЯЖЫ КАТАСТРОФЫ

У вельмі цяжкую сітуацыю трапілі цэлыя галіны вытворчасці. У прыватнасці, польская малочная прамысловасць знаходзіцца на мяжы катастрофы з-за высокіх затрат на энергію і абмежаванняў на энерга- і газазабеспячэнне, паведаміла газета Biznes Wprost. Асацыяцыя перапрацоўшчыкаў малака краіны звярнулася да ўрада з просьбай аказаць падтрымку вытворцам малочнай прадукцыі.

Малочнікі атрымліваюць лісты ад пастаўшчыкоў энерга- і газазабеспячэння з папярэджаннем аб увядзенні абмежавальных мер па спажыванні гэтых камунальных паслуг да ўзроўняў, якія не даюць магчымасці падтрымліваць вытворчасць, захоўванне і нават эксплуатацыю ўнутрыпляцовачных ачышчальных збудаванняў. «Перапрацоўка малака з'яўляецца спецыфічнай галіной харчовай прамысловасці, паколькі, у адрозненне ад іншых галін сыравіна, гэта значыць малако, не можа чакаць некалькі дзён для перапрацоўкі, а гатовыя прадукты не могуць захоўвацца без зададзенага ўзроўню энергазабеспячэння», — заявілі прадстаўнікі малочнага бізнесу.

Перапрацоўшчыкі малака адзначаюць, што недахопу малака на малочных заводах няма, а праблема заключаецца менавіта ў высокіх энергазатратах. Яны папярэджваюць, што ўсяго два-тры дні праблем з энергазабеспячэннем могуць прывесці да сапраўднай катастрофы: цяжкасці ўзнікнуць не толькі ў малаказаводаў і фермераў, у якіх закупляецца малако, але і ў пакупнікоў, якія сутыкнуцца з немагчымасцю набыць неабходныя малочныя прадукты ў магазінах і на рынках. Прадстаўнікі асацыяцыі паведамілі, што папярэдзілі ўрад аб праблеме і нават прапанавалі шляхі вырашэння, але не атрымалі ніякага адказу ад палітыкаў.

### СПІРАЛЬ СМЕРЦІ

Крызіс у Польшчы непазбежны, паколькі вірус папулізму разбурае сацыяльную тканіну, спусташае эканоміку і прыводзіць палітыку да выраджэння. Такім чынам, Польшча трапіла ў «спіраль смерці». Такое меркаванне ў Newsweek Polska выдаў вядомы ў Польшчы сацыёлаг, прэзідэнт медыядома OMD Якуб Бяржынскі. Эксперт рэзка раскрытыкаваў сацыяльную і эканамічную палітыку кіруючай партыі «Права і справядлівасць». «Мы асуджаныя на шок ад крызісу, калі грошы проста закончацца», — заўважыў ён. Па словах Якуба Бержынскага, рэальны дэфіцыт Польшчы большы, чым калісьці ў Грэцыі падчас крызісу.

З 2016 года сума грошай, выведзеных з бюджэту ўрадам «Праву і справядлівасці», склала астранамічную суму ў 1,5 трыльёна злотых. «Гэта трохгадовы бюджэт усёй краіны!» — адзначыў Якуб Бяржынскі. Па яго меркаванні, «горкая праўда ў тым, што выхаду са спіралі няма». Эксперт канстатуе: польскія палітыкі «завялі механізм самаразбурэння» краіны.

І працягваюць актыўна яго падкручваць — стала вядома, што ў новым навучальным годзе вучні польскіх школ будуць навучацца карыстанню зброяй. Такія заняткі стануць абавязковай часткай школьнай праграмы, паведаміла ТАСС са спасылкай на заяву Мінадукацыі Польшчы. Як адзначыла ведамства, патрабуецца «дапаўненне мэт адукацыі атрыманнем навыкаў страляць і падрыхтоўкі вучняў да дзеянняў, выкліканых ваеннымі ўмовамі». Паведамляецца, што ўрокі стральбы пачнуцца ўжо 1 верасня. Яны ўключаны ў праграму вучобы васьмі класаў агульнаадукацыйнай школы, а таксама першыя класы ліцэяў. Навучанне стральбе з пнеўматычнай зброі будзе праходзіць у спартыўных залах, з агнястрэльнай — у цірах і на палігонах. У дадзеную праграму таксама ўключана навучанне дзяцей арганізацыі выратавальных работ ва ўмовах горада.

Ні для каго не сакрэт, што кіруючая польская партыя «Права і справядлівасць» гадамі дабіваецца для Польшчы статусу аднаго з сусветных лідараў. Гэтым жаданнем умела карыстаецца Белы дом. Мэта простая: стварыць яшчэ адну гарачую кропку ў Еўропе і чарговы раз пайграць мускуламі перад Расіяй. Пра гэта гаворыцца ў аналітычным артыкуле аглядальніка польскага часопіса Dziennik Polityczny Ханны Крамер. Яна лічыць, што для гэтага ўжо рыхтуецца глеба. Так, у краіне імкліва нарастае русафобія. Пад маркай пагрозы з усходу амерыканцы спрыяюць мілітарызацыі Польшчы, тым самым правакуючы Расію і ствараючы напружанасць у рэгіёне. Цяпер Польшча займае чацвёртае месца ў свеце па колькасці ў краіне амерыканскіх вайскоўцаў.

Акрамя таго, з кожным днём партыя «Права і справядлівасць» усё больш уцягваецца ў канфлікт ва Украіне, пастаўляючы зброю, навучаючы ваеннаму рамяству ўкраінскіх нацыяналістаў і прасоўваючы палітыку Кіева. ЗША выкарыстоўвалі Украіну для адпрацоўкі механізму па ўцягванні шматнацыянальных дзяржаў у вайну. Аднак асноўную бітву з Расіяй Вашынгтон можа паспрабаваць развязаць на тэрыторыі Польшчы. Як заўважыла Ханна Крамер, такі зыход не будзе дзіўным, бо для амерыканцаў грамадзяне Польшчы і Украіны — усяго толькі гарматнае мяса.

**Пётр ДУНЬКО.**

### Даслоўна

#### «Селі на амерыканскую кабылу і скачуць па Еўропе»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з працоўным калектывам Мёрскага металапракатнага завода выказаўся аб паводзінах палітыкаў, якія знаходзяцца ў кіраўніцтве Польшчы.

«Паглядзіце ў Польшчы. Самая агрэсіўная ў адносінах да нас дзяржава. Не разумею — навошта? У нас жывуць этнічныя палякі, нармальныя людзі. Нядрэнна працуюць. Адзінкі ёсць ачумелыя, дык у нас і беларусаў такіх хапае, — сказаў беларускі лідар. — Нармальна можна жыць і працаваць. Чаго ім не хапае? Рэйтынг іх лідараў ужо ніжэйшы за 30 працэнтаў».

«Яны селі на амерыканскую кабылу і скачуць па Еўропе. Немцы іх ненавідзяць ужо навокал, але церпяць. Чаму? Таму што амерыканцы іх падтрымліваюць. Яны ўжо гатовы частку Украіны забраць, Беларусь яны цалкам гатовы праглынуць. Не атрымаецца, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта да часу. Там няма з кім сёння размаўляць».

ТАЯМНІЦЫ І АДКРЫЦЦІ

Ад вінта!

# Палёты новай фармацыі

**Даследчыкі прадставяць прататып беспілотнага аэратаксі**



**Расійскія вучоныя плануюць зрабіць гэта на працягу года, пра што і распавялі ў прэс-службе Міністэрства навукі і вышэйшай адукацыі Расійскай Федэрацыі. Распрацоўкай займаецца Маскоўскі авіяцыйны інстытут (МАІ) у рамках федэральнай праграмы Мінадукнавукі Расіі «Прыярытэт-2030».**

«На працягу года будзе прадстаўлены дэманстратар лятальнага апарата мультыротарнай схемы — «аэратаксі», на якім будуць адпрацаваны асноўныя канструктарскія і тэхналагічныя рашэнні. У прыватнасці, плануецца выпрабаваць электрычную сілавую ўстаноўку, што ствараецца ў МАІ, правесці выпрабаванні аўтаномнай сістэмы кіравання, сістэмы дакладнай візуальнай пасадкі», — распавялі ў прэс-службе ведамства.

Першы вылет апарата запланаваны на 2023 год. Распрацоўшчыкі чакаюць, што ўвод машыны ў эксплуатацыю адбудзецца ўжо ў 2025 годзе, пасля праходжання неабходнай сертыфікацыі. Далей працаваць з беспілотнікамі будуць спецыялісты ў галіне аэрамабільнасці. Падрыхтоўкай кадраў новай фармацыі таксама будуць займацца ў МАІ.

«Да 2030 года навучанне па праграмах магістратуры ў гэтай галіне пройдуць больш за 900 чалавек, а па дадатковых прафесійных праграмах — больш за сем тысяч», — адзначылі ў прэс-службе міністэрства.

Біялогія з анатоміяй

# Небяспека «конскага хваста»

**Стрэс негатыўна ўплывае на валасяныя цыбуліны**

**Трыхолагі з Англіі раскрылі галоўныя прычыны выпадзення валасоў у жанчын. Іх словы прыводзіць часопіс Glamour.**

Так, па словах урача Салі-Эн Травер з Цэнтра трыхалогіі Катсуолда, часцей за ўсё жанчыны губляюць валасы з-за хранічнага стрэсу. Паводле выказвання эксперта, падчас эмацыянальных узрушэнняў валасяныя цыбуліны пераходзяць у фазу спакою прыкладна на тры месяцы, а затым выпадаюць. Аднак доктар запэўніла, што праз чатыры месяцы пасля знікнення стрэсавых фактараў рост валасоў зноў прыходзіць у норму.



Акрамя таго, раптоўная страта вагі і змены ў сілкаванні таксама вядуць да выпадзення пасмаў. Травер падкрэсліла, што гэта звязана з недахопам пажыўных рэчываў, якія паступаюць у арганізм разам з ежай. Так, справіцца са стратай валасоў дапаможа павелічэнне колькасці спажыванага бялку.

Трыхолаг з Лондана Інанч Эмір дадаў, што валасы могуць выпадаць з-за залішне пругкага перацягвання іх гумкамі: «конскі хвост» можа моцна пашкодзіць пасмы, калі завязваць яго занадта туга. Імкніцеся беражліва ставіцца да сваіх валасоў. Празмернае выкарыстанне стайлінгавых сродкаў таксама разбуральна ўплывае на іх структуру».

Акрамя вышэйпералічаных прычын, дактары адзначылі, што высокая тэмпература цела, дэфіцыт жалеза і вітамінаў, цяжарнасць і захворванні шчытападобнай залозы таксама могуць негатыўна адбівацца на здароўі валасоў. У выпадку празмернага іх выпадзення неабходна звяртацца да ўрача, каб спецыяліст устанавіў дакладныя прычыны працэсу і пабудовы адэкватнага плана па выздараўленні.

Ад пачатку свету

# Монстр з Камчаткі



**Знойдзены шкілет дагістарычнага марскога драпежніка**

**Навуковыя супрацоўнікі, якія вядуць геалагічную разведку недалёка ад вусця ракі Шаманка ў Камчацкім краі, знайшлі пазванкі мегаладона.**

Палеантолагі выявілі шкілетныя астанкі дагістарычнага марскога драпежніка на беразе Ахоцкага мора. Знойдзены поўны хрыбетны слуп мае дыяметр каля 33 сантыметраў. Акрамя таго, ад жывёлы захавалася каля 150 зубоў у выдатным стане.

Мегаладон — найбуйнейшая драпежная акула ў гісторыі Зямлі. Памер дагістарычнай рыбы дасягае да 20 метраў, вага — ад 41 да 47 тон. Раней рэшткі старажытнага драпежніка знаходзілі ў Паўночнай і Паўднёвай Амерыках, Еўропе, Афрыцы, а таксама Пуэрта-Рыка, Кубе, Ямайцы, на Канарскіх астравах, у Аўстраліі, Новай Зеландыі, Японіі, Мальце, Грэнадзінах і Індыі.

Здароўе на талерцы

# «Фільтруй» свой кафеін!



**Якая сувязь паміж спажываннем кавы і здароўем нырак?**

**Навукоўцы групы CIBEROBN на чале з Хордзі Саласам і Андрэсам Дыясам з Універсітэта Ровіра-і-Віргілі вызначылі сувязь паміж спажываннем кавы, гарбаты і змяненнем хуткасці клубочкавай фільтрацыі, якая з'яўляецца галоўным маркерам здароўя нырак. Аб гэтым паведамляецца на партале Mundo deportivo.**

Даследчыкі вывучылі анамнез і звычкі 5851 пажылога чалавека. Ва ўсіх іх назіраліся праблемы з вагой. Аказалася, што спажыванне кавы і гарбаты было звязана са зніжэннем хуткасці клубочкавай фільтрацыі пры наступным назіранні на працягу года. Навукоўцы высветлілі, што ў тых, хто піў больш за два кубкі кавы ў дзень (50 мілілітраў кафеіну на кубак), хуткасць клубочкавай фільтрацыі пагаршаецца мацней, чым у тых, хто п'е гэты напой менш за кубак у дзень або не ўжывае кавы наогул.

Высветлілася, што спажыванне больш чым двух кубкаў кавы ў дзень вяло да таго, што рызыка хуткай страты функцыі нырак павышалася на 19 працэнтаў. Такую ж шкоду ныркам можа наносіць і чай, у якім змяшчаецца кафеін.

Тэхналогіі будучыні

# Атрымаць свабоду перамяшчэння

**Навукоўцы і студэнты стварылі актыўны экзашкілет чалавека**

**Студэнты і даследчыкі НДУ «МЭІ» распрацавалі макет апарата, які крочыць, — прататып экзашкілета, які здольны не толькі ўтрымліваць без старонняй дапамогі дзіця ў вертыкальным становішчы, але і дазволіць яму перасоўвацца, здзяйсняючы крокі за кошт аўтаматычнага дыстанцыйнага кіравання.**



«Перад удзельнікамі распрацоўкі стаяла найскладанейшая задача пабудовы сістэмы аўтаматычнага кіравання рухам, якая дазволіць дзіцяці самастойна ўтрымліваць вертыкальнае няўстойлівае становішча раўнавагі», — адзначыў загадчык кафедры робататэхнікі НДУ «МЭІ» Ігар Мяркур'еў.

Сістэма на час вызваліць рукі бацькам дзіцяці і медыкам, а малы зможа ўпершыню адчуць свабоду самастойнага перамяшчэння.

Універсальны экзашкілет, здольны каардынаваць баланс падчас руху, не толькі спатрэбіцца для дапамогі дзецям з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, але і стане памочнікам у вырашэнні стратэгічных пытанняў у авіяцыі. Напрыклад, пілот рэактыўнага самалёта з дапамогай падобнага вышынна-пілатажнага касцюма здольны лягчэй пераносіць перагрузкі пры выкананні фігур вышэйшага пілатажу. У гэтым яму таксама дапамагае сістэма аўтаматычнага кіравання пілатажным гарнітурам, з дапамогай якога падтрымліваецца ціск, а цела абараняецца ад перагрузкі.

Спецыялісты знайшлі рашэнне знаходжання крыніцы энергіі, неабходнай для забеспячэння аўтаномнасці функцыянавання сілавых элементаў касцюма. У якасці яго могуць быць скарыстаны вадародныя паліўныя элементы, распрацаваныя ў МЭІ, якія ўяўляюць сабой прылады пераўтварэння хімічнай энергіі ў электрычную. Яны маюць досыць высокі каэфіцыент карыснага дзеяння, які істотна пераўзыходзіць каэфіцыент карыснага дзеяння рухавіка ўнутранага згарання, і, у адрозненне ад апошняга, не забруджваюць навакольнае асяроддзе выхлапнымі газамі.

Пласты гісторыі

# Руіны са дна

**З-пад вады паказаўся горад з палацам**

**У Іраку па меры высыхання вадасховішча на паверхню выходзіць старажытны горад. Пра гэта паведамляе Science Alert.**



У апошнія месяцы Ірак асабліва моцна пацярпеў ад засухі. У выніку гэтага вадасховішча Масула змялела, а на яго месцы пачаў праступаць старажытны горад, узрост якога налічвае 3400 гадоў.

Месца археалагічных раскопак было названа Кемунэ. Руіны складаюцца з палаца і некалькіх іншых буйных пабудоў, якія адносяцца да бронзавага веку. Навукоўцы лічаць, што руіны могуць быць старажытным горадам Закіку, ажыўленым цэнтрам імперыі Мітані, якая квітнела на берагах ракі Тыгр паміж 1550 і 1350 гадамі да нашай эры.

Апроч палаца, даследчыкі выявілі яшчэ некалькі цікавых збудаванняў. Да іх адносяцца вялікае ўмацаванне са сцяной і вежамі, прамысловы комплекс і вялізны шматпавярховы складскі будынак. Дзіўна, але археолагі таксама выявілі некалькі керамічных збаноў, якія змяшчаюць больш за 100 неабпаленых гліняных таблічак з клінапіснымі надпісамі. Каманда спадзяецца, што гэтыя запісы могуць змяшчаць некаторую інфармацыю аб тым, хто жыў у горадзе, і, магчыма, нават аб самім землятрусе, што прывёў да яго гібелі.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# ЛЕТНЯЯ АБРЭЗКА ПАРЭЧАК

**Парэчкі — адзін з самых надзейных і вынослівых ягаднікаў, які дастаўляе гаспадарам мала клопатаў. Іх лёгка вырошчваць, бо яны абсалютна непатрабавальная, заўсёды добра пладаносяць і вельмі даўгавечныя. Для багатага плоданашэння і добрай якасці ягад кустам парэчак неабходна багатая перагноем, раўнамерна вільготная глеба, сонечнае размяшчэнне, хоць і зацяненне ім не перашкода.**



Высаджваць парэчкі трэба на такую глыбіню, каб верхні край землянога кому быў на 5 см ніжэйшы за край лункі. Гэта стымулюе ўтварэнне новых парасткаў і памяншае адмоўнае ўздзеянне нізкіх тэмператур.

Усё часцей вядуцца спрэчкі аб тым, ці трэба абразаць ягадныя кусты ўлетку. Так, напрыклад, многія аўтары лічаць, што летняя абрэзка такіх хмызнякоў, як парэчка і агрэст, мае свае перавагі: па-першае, паляпшаецца асвятленне маладых асноўных парасткаў, дзякуючы чаму маладыя парасткі з сярэдзіны куста маюць дастаткова месца для інтэнсіўнага росту. Па-другое, паляпшаецца забеспячэнне куста пажыўнымі рэчывамі з глебы, а таксама фотасінтэз пакінутых парасткаў. Існуе і іншае меркаванне, што ягадныя кусты са слабым ростам не варта абразаць улетку. Такі падыход абгрунтоўваецца тым, што летняе абразанне, як правіла, прыводзіць да аслабленага росту парасткаў і ўзмацнення генератыўнага развіцця расліны.

Асноўная колькасць ягад у чырвонай і белай парэчкі ўтвараецца на бакавых парастках двух- і трохгадовых асноўных галін. Пачынаючы з чацвёртага года ўраджайнасць прыкметна падае. Таму штогод пасля збору ўраджаю выразайце дзве-тры старыя шкілетныя галінкі да ўзроўню глебы. Вельмі важна выдаліць такія галіны цалкам, не пакінуўшы пянька. Ажыццяўляючы такое прарэджвальнае абразанне, вы тым самым вызваляеце месца для росту доўгіх маладых прыкаранёвых парасткаў, а таксама забяспечваеце лепшае асвятленне ягад, якія з'явяцца ў наступным годзе. З маладых галінак выберыце дзве-тры наймацнейшыя і добра размешчаныя ў прасторы — яны і заменяць выдаленыя шкілетныя галіны. Усе астатнія маладыя прыкаранёвыя парасткі, часта тонкія і нізкарослыя, якія загушчаюць куст, варта выразаць, а яшчэ лепш выдраць. Пераканайцеся, што куст мае 8, максімум 12 асноўных парасткаў, не старэйшых за чатыры гады.

Пасля выдалення старых асноўных галінак прымаюцца за бакавыя парасткі маладых галінак. Спачатку варта выдаліць усе адгалінаванні на ўзроўні 30—40 см. Бакавыя парасткі, якія растуць ад нізу куста, у плане ўраджайнасці нецікавыя, бо з-за недахопу сонечнага святла ягады тут дрэнна спеюць. Выдаліце таксама і канкурэнтаў асноўным галінкам, якія растуць вертыкальна, бо яны толькі загушчаюць куст і не пладаносяць.

Усе бакавыя адгалінаванні, на якіх былі ягады, кароцяць адразу ж пасля збору ягад ці наступнай вясной прыблізна на адзін сантыметр да сучка, на якім пазней вырасце новы пладаносны парастак. Не чапайце маладыя бакавыя адгалінаванні, яны забяспечаць ураджай у наступным годзе. Калі ж маладыя бакавыя адгалінаванні размешчаны занадта густа (адлегласць паміж імі складае менш за 10 см), то кожны другі варта трохі падрэзаць. У выпадку сумневу пакіньце лепш менш пладаносных парасткаў. Чым менш у куста пладаносных парасткаў, тым больш інтэнсіўны будзе рост новых.

Абразанне чорнай парэчкі робіцца крыху інакш, чым чырвонай і белай, бо чорная парэчка пладанасіць у асноўным на аднагадовым прыросце. Больш за ўсё буйных ягад збіраюць з аднагадовых бакавых прыростаў, размешчаных на 2-3-гадовых галінках. На асноўных галінках выдаляюць унізе ўсе слабыя парасткі і кожнай вясной абразаюць асноўныя галінкі над другім ці трэцім бакавым адгалінаванні. Гэтак жа, як і ў чырвонай парэчкі, цалкам выдаляюць старыя асноўныя галінкі са слабым прыростам, вызваляючы месца для росту новых парасткаў.

Здарэнне

# ВЫКРАДЗЕНЫМ ТЭЛЕФОНАМ РАСПЛАЦІЎСЯ Ў ТАКСІ

**У Савецкае РУУС сталіцы па дапамогу звярнуўся мінчанін, які расказаў аб страце мабільнага тэлефона коштам 500 рублёў.**

Пацярпелы растлумачыў, што адпачываў у грамадскім месцы ў кампаніі сяброў і ў нейкі момант яго гаджэт выпаў з кішэні. Знайсці тэлефон мінчанін самастойна не змог.

Супрацоўнікі крымінальнага вышуку ўстанавілі, што мабільны тэлефон забраў 16-гадовы навучэнец сталічнага каледжа. Па інфармацыі ГУУС Мінгарвыканкама, хлопец падабраў гаджэт і з'ехаў на таксі. Мабільны тэлефон ён перадаў кіроўцу таксі ў якасці аплаты праезду ў сувязі з адсутнасцю наяўных грошай, абяцаючы на наступны дзень прынесці грошы і забраць сотавы.

Аператыўнікі канфіскавалі тэлефон для наступнай перадачы ўладальніку. Следчыя далі прававую ацэнку дзеянням падазраванага і распачалі крымінальную справу за крадзеж.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Даты | Падзеі | Людзі

**18 ЖНІЎНЯ**

У краіне

**1887** год — Мінская гарадская дума аднагалосна прыняла рашэнне аб узвядзенні будаўніцтва будынка гарадскога тэатра, падборы месца пад яго, выдзяленні з казны пяць тысяч рублёў і зборы добраахвотных ахвяраванняў. Тэатр вырашана было будаваць на рагу Аляксандраўскага сквера, на скрыжаванні вул. Падгорнай (цяпер К. Маркса) і Петрапаўлаўскай (Ф. Энгельса).

**1891** год — нарадзіўся (г. Койданава, цяпер — Дзяржынск) Іван Фёдаравіч Шпілеўскі, матрос-рэвалюцыянер Балтыйскага флоту, пазней — гісторык-краязнавец. З 1912 года служыў матросам у Кранштаце. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917-га член Ваенна-марскога рэвалюцыйнага камітэта, удзельнік падаўлення антыбальшавіцкага выступлення Краснова. Уваходзіў у атрад браняпоезда, высланага на дапамогу паўстаўшым рабочым Масквы. З 1918 года ў Петраградзе: камісар і член Савета камісараў Балтыйскага флоту, удзельнік баёў супраць Юдзеніча. З 1922 года жыў у Беларусі. Быў старшынёй Койданаўскага райвыканкама, інспектарам лясоў Полацкай акругі. У 1930-я гады — навуковы супрацоўнік, кіраўнік спраў АН Беларусі, сакратар Цэнтральнага бюро краязнаўства.

**1922** год — нарадзіўся (г. Калуга, Расія) Усевалад Вітольдавіч Кухта, беларускі рэжысёр. У 1951—1952 гадах — рэжысёр Беларускага тэатра імя Я. Купалы, у 1957—1961-м — Рэспубліканскай студыі тэлебачання. Сярод пастановак: «На досвітку» А. Макаёнка, «Уцёкі» Д. Шчаглова і іншыя. Стваральнік першых тэлевізійных спектакляў на беларускім тэлебачанні «Брат мой, вораг мой» М. Уілсана, «Маленькія трагедыі» А. Пушкіна, «Месячная саната» К. Паўстоўскага. Першым на расійскай прафесіянальнай сцэне паставіў «Паўлінку» Я. Купалы.

**1943** год — адбыўся бой падраздзяленняў 120-га, 130-га, 208-га, 277-га, 345-га партызанскіх атрадаў супраць батальёна нямецка-фашысцкіх захопнікаў у в. Мацевічы Бярэзінскага раёна, які ўвайшоў у гісторыю Вялікай Айчыннай вайны пад назвай Мацевіцкі бой. Батальён 700-га ахоўнага палка гітлераўцаў 15 жніўня заняў в. Мацевічы для рабавання насельніцтва. Уначы 18 жніўня партызаны акружылі вёску і раптоўна напалі на ворага. За 1 гадзіну бою было знішчана 138 і ўзята ў палон 37 гітлераўцаў, захоплены зброя, боепрыпасы і амуніцыя, дзве перасовачныя радыёстанцыі, каля 60 коней, харчаванне, а таксама збожжа, нарабаванае акупантамі ў насельніцтва.

У свеце

**1787** год — у Санкт-Пецярбургу адбылася першая ў гісторыі Расіі рабочая дэманстрацыя — 400 будаўнікоў прынеслі скаргу Кацярыне II на свайго наймальніка Далгова.

**1824** год — нарадзіўся П'ер Мартэн, французскі металург, вынаходнік мартэнаўскага сталеплавільнага працэсу.

**1900** год — рускі інжынер Канстанцін Перскі прапанаваў слова «тэлебачанне».

**1968** год — кіраўніцтва краін Варшаўскага дагавора прыняло рашэнне аб уводзе войскаў у Чэхаславакію.

**1984** год — у Маскве адкрыліся спаборніцтвы «Дружба-84». Гэта была серыя міжнародных спаборніцтваў, праведзеных у чэрвені—верасні 1984 года ў дзевяці дзяржавах «сацыялістычнага лагера» (СССР, Балгарыя, Венгрыя, ГДР, КНДР, Куба, Манголія, Польшча, Чэхаславакія), якія байкаціравалі Алімпійскія гульні ў Лос-Анджэлесе. Спаборніцтвы праводзіліся пад афіцыйным дэвізам «Спорт— дружба—мір». У СССР неаднаразова падкрэслівалася, што «Дружба-84» не з'яўляецца альтэрнатывай Алімпійскім гульням, таму спаборніцтвы былі праведзены ў тэрміны, якія не супадалі з часам правядзення Гульняў у ЗША. Спаборніцтвы праводзіліся па ўсіх алімпійскіх відах спорту, акрамя футбола, а таксама ў трох неалімпійскіх відах — барацьбе самба, настольным тэнісе і тэнісе (у тэнісе на гэтых Гульнях праводзіліся паказальныя спаборніцтвы). У некаторых відах праграма адрознівалася ад алімпійскай.

Так гаварыў...

**ПЛАЎТ:**

*«Хто ўцякае ад сваіх, таму доўга давядзецца бегчы».*

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 5.53 | 20.33 | 14.40 |
| Віцебск | — 5.39 | 20.26 | 14.47 |
| Магілёў | — 5.43 | 20.23 | 14.40 |
| Гомель | — 5.44 | 20.15 | 14.31 |
| Гродна | — 6.08 | 20.46 | 14.39 |
| Брэст | — 6.13 | 20.43 | 14.30 |

**Месяц**

***Поўня 12 жніўня.***
***Месяц у сузор'і Цяльца.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Дар'і, Еўдакіі, Марыі, Ноны, Сямёна.*
***К.*** *Алены, Браніславы, Ілоны, Брніслава.*



Фота Настассі ГРУК.

## ЗАЎТРА




УСМІХНЕМСЯ

**Добра выхаваны чалавек не стане эканоміць на падзяках у тым выпадку, калі падзякамі можна замяніць грошы.**

За пяць хвілін сваркі даведаешся пра чалавека больш, чым за пяць гадоў жыцця побач.

**Збоку здавалася, што Марыначка думае.**

**Але насамрэч у яе галаве бегаў самотны прусак і лямантаваў: «Што рабіць, што рабіць!?»**

У брыгадзе грузчыкаў кожны працоўны дзень — разгрузны.





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

для зваротаў: zvarot@zviazda.by



ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1856.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 17 жніўня 2022 года.